№ 28 (530) 2 жніўня 2007 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі

# Газавая вайна-3

Выдачу стабілізацыйнага крэдыту Беларусі абставілі палітычнымі і эканамічнымі ўмовамі. Зь пятніцы «Газпром» можа напалову зьменшыць падачу паліва Беларусі.

«Газпром» накіраваў новапрызначанаму старшыні «Белтрансгазу» ліст з паведамленьнем, што мае намер з 3 жніўня абмежаваць падачу паліва прапарцыйна фактычнай аплаце — на 45%.

ААТ «Газпромэкспарт» абвесьціла пра сваё рашэньне датычна Беларусі і замежным спажыўцам газу: «Газпром» зробіць усе магчымыя захады дзеля транспартаваньня расейскага газу цераз тэрыторыю Беларусі цалкам згодна з наяўнымі абавязкамі перад эўрапейскімі пакупнікамі». Гэта адкрытая перасьцярога Менску ад перакрыцьця газавага экспарту ў Эўропу.

Эўрасаюз неадкладна заклікаў Расею і Беларусь «вырашыць спрэчку мірным шляхам».

Агульная запазычанасьць Беларусі за газ складае 456 мільёнаў даляраў. З пачатку году Беларусь па дамоўленасьці з расейскім манапалістам аплочвала толькі 55% кошту паліва. Астатняе мусіла быць выплачана да 23 ліпеня, пасьля сплаты «Газпромам» 625 мільёнаў за акцыі «Белтрансгазу». Грошы паступілі на рахунак беларускага ўраду ў чэрвені, аднак Беларусь сваіх абавязкаў ня выканала. Гэта дало «Газпрому» фармальныя падставы для чарговай заварухі.

Стала відавочна, што візыт беларускага прэм’ера ў Маскву 30 ліпеня быў правальным. Масква абставіла згоду на выдачу стабілізацыйнага крэдыту Беларусі палітычнымі і эканамічнымі ўмовамі.

**Мікола Бугай**

Іншыя матэрыялы на тэму — **старонка 3.**

## Я ня здамся бяз бою



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Шэраг дармовых канцэртаў «Акіяну Эльзы» пачаўся зь пералому. Старонка 2.**

Гэты нумар «Нашай Нівы» выйшаў цалкам дзякуючы спадару **Міхасю Лужынскаму**. Вялікі дзякуй.

**Шаноўныя людзі!**

«Наша Ніва» шукае распаўсюднікаў для продажу газэты на вуліцах і ў электрычках. Справа выгадная і надта патрэбная.

Продаж ажыцьцяўляецца на аснове дамоваў.

Зьвяртацца праз тэл.: (017) 284–73–29, (029) 260–78–32, (029) 618–54–84.

## ЗАМЕСТ КАМЭНТАРУ РЭДАКЦЫІ




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Я ня здамся бяз бою

За нацыянальны сьцяг на канцэрце «Акіяну Эльзы» зламалі руку.

У суботу, 28 ліпеня, на канцэрце гурту «Акіян Эльзы», які праходзіў у Горадні ў рамках рэклямнага туру «Velcom»-у, спэцназаўцы зламалі руку **Аляксандру Шумкевічу (на фота)**, аднаму зь лідэраў «Маладых дэмакратаў» — моладзевай структуры Аб`яднанай грамадзянскай партыі.

Здарылася за 15 хвілін да заканчэньня канцэрту, калі некалькі моладзевых актывістаў разгарнулі бел-чырвона-белы сьцяг над натоўпам. Да Шумкевіча ззаду прабіліся міліцыянты і людзі ў штацкім, заламалі рукі і выцягнулі з Савецкай плошчы, дзе праходзіў канцэрт. На просьбу Шумкевіча даць магчымасьць забраць свой заплечнік, яны адказалі некалькімі ўдарамі нагамі. Пасьля юнака даставілі ў Ленінскі РУУС Горадні і зьмясьцілі ў ізалятар часовага ўтрыманьня. У пратаколе аб затрыманьні фігуравала «традыцыйнае» тлумачэньне: нецэнзурна лаяўся ў грамадзкім месцы.

«Рука так разбалелася, — расказвае Алесь, — што на наступны дзень я зьвярнуўся да дактароў».

Хлопец падаў скаргу на дзеяньні міліцыянтаў. Ён мае прайсьці агляд у бюро судмэдэкспэртызы.

У часе афіцыйных і культурных імпрэзаў моладзь нярэдка ўздымае ці запускае ў неба на шарыках нацыянальныя сьцягі. Упершыню пры гэтым юнаку зламалі руку.

«Я ня здамся бяз бою», — так сьпявае «Акіян Эльзы». А Аляксандар працягвае навучаньне ў аўташколе, нягледзячы на гіпс.

**МБ**

## АПЫТАНЬНЕ НА NN.BY

**Як, па-Вашаму, за 10 гадоў Беларусь...**

| | |
|---|---|
| застанецца сатэлітам Расеі | 78 (21.5%) |
| будзе дабівацца ўступленьня ў Эўрасаюз | 86 (23.7%) |
| пяройдзе да самаізаляцыі | 62 (17.1%) |
| будзе ўмацоўваць беларускую адметнасьць і захоўваць нэйтралітэт | 89 (24.5%) |
| за 10 гадоў канец сьвету адбудзецца | 48 (13.2) |

Усяго прагаласавала: 363



# Купала ў кожны дом




**Выйшаў першы плякат з сэрыі «Нацыянальныя героі Беларусі». Каб набыць, пытайцеся праз тэл. (029) 505-39-11 або праз e-mail: plakat@biz.by**

# Масква выкручвае рукі

Расея хоча, каб беларускі бок разьлічыўся за крэдыт акцыямі прадпрыемстваў.

Прэм’ер-міністар Беларусі Сяргей Сідорскі 30 ліпеня пабываў з працоўным візытам у Маскве. Там ён спаткаўся з старшынём ураду Расеі Міхаілам Фрадковым.

Галоўнай тэмай сустрэчы стануць дэталі атрыманьня Беларусьсю гіганцкага стабілізацыйнага крэдыту. Беларусь запрасіла 1,5 млрд даляраў. Гэтыя грошы маюць кампэнсаваць дадатковыя выдаткі беларускай гаспадаркі ў сувязі з ростам цэнаў на энэрганосьбіты.

Прынцыповае рашэньне аб крэдыце Масква прыняла. Застаюцца дэталі, — заявіў віцэ-прэм’ер расейскага ўраду Аляксей Кудрын у пятніцу. Аднак у дэталях, як вядома, хаваецца д’ябал.

Узамен за крэдыт Расея дамагаецца прыватызацыі шэрагу прыбытковых прадпрыемстваў Беларусі. Як патлумачыў маскоўскі беларусазнаўца Андрэй Суздальцаў, Масква настойвае на тым, каб беларускі бок разьлічыўся за крэдыт акцыямі прадпрыемстваў.

Як відно, бакі да згоды ў гэтым пытаньні так і не дайшлі. Крыніца ў расейскім урадзе паведаміла агенцтву Прайм-ТАСС, што «ўрады Расеі і Беларусі працягнуць узгадненьне умоваў вылучэньня Беларусі крэдыту». Крыніца пацьвердзіла, што пытаньне крэдыту абмяркоўвалася на сустрэчы кіраўнікоў урадаў, і яны вырашылі працягнуць працу з гэтым пытаньнем і ўзгадненьне пазыцый.

Прэм’ер Расеі Міхаіл Фрадкоў паведаміў, што на перамовах «абмяркоўваліся пытаньні супрацы ў нафта-газавай і фінансавых сфэрах». «Мы дамовіліся прадоўжыць гэтую працу. Пытаньні складаныя, і ў адначасьсе не вырашаюцца. Мы ўзялі на хатнюю працу пэўныя пункты магчымых дамоўленасьцяў, давялі адзін да аднога аргумэнты бакоў», — цытуе Фрадкова Прайм-ТАСС.

У рамках паездкі таксама адбудзецца сустрэча С. Сідорскага з губэрнатарам Маскоўскай вобласьці Барысам Громавым.

Візыту Сідорскага папярэднічала кампанія па ягонай дыскрэдытацыі. Шэраг беларускіх інтэрнэт-рэсурсаў спрабавалі давесьці, што Масква зь Сідорскім размаўляць адмаўляецца.

Пачалося гэта з артыкулу ў маскоўскім «Коммерсанте» аб непазьбежнай адстаўцы Сідорскага і замене яго на Навумава. Паводле інфармацыі «НН», за гэтымі чуткамі стаяў беларускі прадпрымальнік С., які мае бізнэс у Расеі.

Таксама і ў Беларусі зьявіліся публікацыі аб магчымай адстаўцы прэм’ера.

Ператварэньне галоўнага перамоўшчыка ў «кульгавую качку» ўскладніла б перамоўныя пазыцыі Беларусі.

**Мікола Бугай**



Візыту Сідорскага ў Маскву папярэднічала кампанія па ягонай дыскрэдытацыі. Шэраг інтэрнэт–рэсурсаў спрабавалі стварыць уражаньне, што Масква зь Сідорскім размаўляць адмаўляецца.

# Дэфіцыт замежнага гандлю набывае беспрэцэдэнтны памер

За першую палову году ён дасягнуў $1793,4 млн. Аднак самае трывожнае для эканамічнае незалежнасьці Беларусі ня гэта.



Дэфіцыт замежнага гандлю таварамі за першую палову году дасягнуў $1793,4 млн. Гэтыя зьвесткі распаўсюдзіла сёньня Міністэрства статыстыкі і аналізу. Прычым чэрвеньскія вынікі замежнага гандлю найгоршыя: мінус вырас на $342,7 млн. Рост дэфіцыту ў параўнаньні зь мінулым годам склаў 93%.

Аднак самае трывожнае для эканамічнае незалежнасьці Беларусі ня гэта. Зноў папаўзла ўгару залежнасьць Беларусі ад аднае краіны. Прычым гэта тая самая краіна, якая не хавае сваёй ахвоты далучыць Беларусь і пераварыць беларусаў як нацыю.

Доля Расеі ў замежным гандлі Беларусі вырасла да 48,3%. (У экспарце 36,7%, імпарце — 58,1%.) Гэта недапушчальныя лічбы для любой краіны, што дбае пра ўласную бясьпеку.

Калі на адну краіну прыпадае такая высокая доля замежнага гандлю, яна робіцца практычна безабароннаю супраць эканамічнага шантажу, і гэта непазьбежна прыводзіць да поўнай палітычнай залежнасьці.

Для параўнаньня: доля Расеі ў замежным гандлі Латвіі ў 2006 годзе была роўная 8,3%. І яна сувымерная з долямі Літвы, Эстоніі, Германіі і Беларусі ў гандлі нашай паўночнай суседкі.

Доля Расеі ў замежным гандлі Эстоніі, самай пасьяховай у эканамічным сэнсе з былых савецкіх рэспублік, складала 78% на выхадзе з СССР і скарацілася да 11% цяпер.

Што датычыць нашае паўднёвае суседкі, Украіны, дык доля Расеі ў яе замежным гандлі таварамі апошнія гады стабілізавалася на ўзроўні 26—29% (27,5% за першыя пяць месяцаў сёлета).

Дарэчы, дэфіцыт украінскага замежнага гандлю сёлета таксама вырас. Ён склаў за паўгоду каля $4,6 млрд, што на 35% больш, чым за аналагічны пэрыяд году мінулага.

Сам факт росту замежнагандлёвага дэфіцыту ня ставіць прамой пагрозы эканамічнай стабільнасьці. Варта адзначыць, што ў Беларусі адмоўнае сальда роўнае 14,3% ад імпарту, тады як ва Ўкраіне — 16,6%. Пры тым ва Ўкраіне ўзровень валавога ўнутранага прадукту на душу насельніцт-

**Працяг на старонцы 7.**

# Лёгкі сьвяточны хапун

Напярэдадні акцыі 27 ліпеня прысьвечанай гадавіне прыняцьця Дэклярацыі аб дзяржаўным сувэрэнітэце Беларусі ў Менску былі арыштаваныя 15 чалавек. Сярод іх лідэры Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі Павал Севярынец і Аляксей Шэін, маладафронтавец Зьміцер Хведарук, былы палітвязень Аляксей Шыдлоўскі і іншыя. Затрыманьні чакаліся і непасрэдна 27 ліпеня, тым болей што гарадзкія ўлады не далі дазволу на правядзеньне мітынгу-канцэрту на плошчы Бангалор, а адмаўляцца ад сьвяткаваньня ніхто не зьбіраўся.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Міліцыянты выносяць Вальжыну Ш. з-пад помніку Купалу.

А 16:00 моладзевыя актывісты меліся сустрэцца каля Чырвонага касьцёлу з дэпутатамі Вярхоўнага Савету БССР, якія ў 1990 годзе прымалі дэклярацыю аб дзяржаўным сувэрэнітэце. Аднак плошча Незалежнасьці была цалкам перакрытая АМОНам. Ад Кастрычніцкай да Інстытуту культуры не спыняліся «сотыя» аўтобусы, быў блякаваны выхад з мэтро, з прычыны «рамонту эскалятара». На падыходах да плошчы міліцыянты пільна правяралі дакумэнты і рэчы ўсіх падазроных людзей.

Агулам да касьцёлу прыйшло каля 40 чалавек на чале зь Вінцуком Вячоркам, якіх байцы ПМНС хуценька адціснулі ў бок вуліцы Мясьнікова, дзе ўсіх і адпусьцілі.

Наступным пунктам сьвяткаваньня мусіла стаць ускладаньне кветак да помніку Янку Купалу ў аднайменным сквэры. Там сабралася каля 100 чалавек, у тым ліку палітыкі Мікола Статкевіч, Сяргей Скрабец, Алесь Міхалевіч.

Акурат а пятай у сквэр пад'ехалі два аўтазакі з АМОНам. «Чорныя» ўзялі ў кальцо ўсіх удзельнікаў акцыі і павялі па вуліцы Янкі Купалы ў бок вуліцы Багдановіча. Людзі ў гэты час сьпявалі беларускія гімны — «Пагоню», «Разьвітаньне з Радзімай», «Мы выйдзем шчыльнымі радамі», «Магутны Божа».

Давёўшы людзей да скрыжаваньня Багдановіча і Купалы, АМОНаўцы адступілі. Жаданьня ехаць на Бангалор ужо ні ў кога не было, хоць там і дзяжурылі пяць аўтазакаў.

Пазьней стала вядома, што ў гэты дзень міліцыя затрымала моладзевых актывістаў Франака Вячорку (сына лідэра БНФ) і Яраслава Грышчэню. У панядзелак Ленінскі суд Менску асудзіў іх на 7 і 15 сутак арышту адпаведна.

**Зьміцер Панкавец**

## Юнак атруціўся на Акрэсьціна турэмнай ежай

Сяржук Клюеў знаходзіцца ў інфэкцыйным шпіталі. Хлопца арыштавалі на 10 сутак рашэньнем Савецкага райсуду. Яго затрымалі за распаўсюд улётак з заклікам удзельнічаць у акцыі 27 ліпеня, але ў міліцыі абвінавацілі ў нецэнзурнай лаянцы.

У турме на вуліцы Акрэсьціна, пасьля таго як Сяржук зьеў катлету і кашу, яму стала кепска. Лекарка выклікала «хуткую», і хлопца адвезьлі ў інфэкцыйны шпіталь. Там двое сутак зь ім былі канваіры.

Сяржук апавёў, як гэта было: «Я зьеў катлету, мне стала кепска. Лекарка выклікала хуткую дапамогу. Ёй на Акрэсьціна сказалі, што мне патрэбны канвой. Калі мяне прывёз канвой, мне надзелі кайданкі і завялі ў шпіталь. Прыкавалі кайданкамі да койкі і сказалі спаць. Калі я прасіўся ў прыбіральню, яны адмыкалі гэтыя замкі, а потым зноў замыкалі».

Мэдыкі робяць аналізы, і пасьля гэтага, магчыма, стане вядома, чым атруціўся ў турме Сяржук Клюеў.

**Радыё «Свабода»**

# «Хто сказаў, што апэльсіны ў Беларусі нерэнтабэльныя?»

На сэлектарнай нарадзе па пытаньнях жніва збажыны дагаварыліся да перцу і цытрусавых.

У самым пачатку «сур'ёзнай размовы» **Аляксандар Лукашэнка** зазначыў, што яго вельмі хвалюе сытуацыя, якая склалася на рынку зерня ў Эўропе і ў сьвеце. «У Расеі, Украіне, Эўропе хлеба няма. У нас хлеб ёсьць добры, хоць і цяжкі, калі мы яго зьбярэм, то будзем мець нават запас», — разважаў кіраўнік дзяржавы. Лукашэнка размаўляў досыць спакойным тонам і не павышаў голасу.

«У палях ня менш за сем мільёнаў тонаў зерня. На палях добры ўраджай кукурузы, буракоў ды іншых культур», — зь веданьнем справы казаў прэзыдэнт.

Пасьля невялікай прамовы Лукашэнкі справаздачу пачалі трымаць старшыні аблвыканкамаў.

**Канстанцін Сумар** (Берасьце) пачаў прамову з падзякі кіраўніку дзяржавы за дапамогу ў пераадоленьні наступстваў нядаўніх стыхій у вобласьці.

Лукашэнка выказаў зьдзіўленьне і неразуменьне, пра якія стыхіі кажа чыноўнік. Высьветлілася: пра ліўневыя дажджы, якія «бываюць раз на сто гадоў». Прэзыдэнт сказаў, што гэта навала ня толькі для Берасьцейшчыны, але і для ўсёй Беларусі.

«Вы ўпёрліся галавой у сьценку і нічога слухаць ня хочаце. На палях трэба сеяць тое, ад чаго можна атрымаць аддачу. Аднаўляйце мэліярацыйную сыстэму і сейце там. Там, дзе нельга нічога вырошчваць, саджайце лес».

Сумар зазначыў, што ў параўнаньні зь мінулым годам ураджайнасьць павялічылася, хоць і не істотна.

**Уладзімер Андрэйчанка** (Віцебск) лічыць, што сёлета Віцебшчына дасьць як ніколі вялікі ўраджай, а таксама папрасіў даставіць у вобласьць машынаў МАЗ. Іх меліся паставіць у другім паўгодзьдзі.

«Ня так часта Госпад адорвае вас такім ураджаем. У вас ужо мусіць быць плян перакідваньня камбайнаў з поўдня краіны да вас», — праблему МАЗаў Лукашэнка таксама паабяцаў вырашыць.

Ад **Аляксандра Якабсона** (Гомель) Лукашэнка найперш хацеў пачуць пра тое, як ідуць справы з ураджаем цыбулі, гароху, а таксама кукурузы. Галоўнакамандуючы мяркуе, што на Гомельшчыне штогод трэба саджаць болей кукурузы. «У вас клімат ужо, як у Крыме, таму трэба пераарыентоўвацца на іншыя культуры», — сказаў гарант Канстытуцыі.

«Як ня стала Дамашкевіча, то і Гарадзеншчына маўчыць, няма з кім спаборнічаць», — так прэзыдэнт прадставіў старшыню Гарадзенскага аблвыканкаму **Ўладзімера Саўчанку**.

«Калі ласка, калі пачнеце ўбіраць з палёў кукурузу, то запрасіце мяне, я хачу на гэта паглядзець, бо ведаю, што ў вас там усё на найвышэйшым узроўні. Я хачу падзякаваць гарадзенцам за добрую працу», — папрасіў ён.

Дамашкевіча Лукашэнка згадаў і перад выступам новага кіраўніка Меншчыны **Леаніда Крупца**.

«Ну, скажы мне чэсна, ці адбыўся абвал пасьля адстаўкі Дамашкевіча?»

Другое пытаньне да Крупца было: «А што ў вас з малаком»? Старшыня Менскага аблвыканкаму шчыра прызнаўся, што вынікі ня добрыя і ў гэтых паказьніках адбылося паніжэньне.

«Мы ня можам страціць нават паўлітра малака», — папярэдзіў кіраўнік дзяржавы.

«Мільён намалоціш?» — строга запытаўся ў **Барыса Батуры** (старшыні Магілёўскага аблвыканкаму). «Не хачу прагназаваць, але пастараемся», — адказаў чыноўнік.

«Я лавіў сябе на думцы, што сёлета жніво, як ніколі, арганізаванае, прычым без указкі зь верху. Сэлектарная нарада сёньня трэба толькі для таго, каб паказаць, які дарагі нам хлеб», — сказаў Лукашэнка.

«Хто сказаў, што апэльсіны, часнык ці перцы не рэнтабэльныя ў беларускіх умовах? Гэта няпраўда», — адзначыў прэзыдэнт.

На аўторак з палёў прыбралі 50% збожжа, намалочана 3,5 мільёнаў тон. Адміністрацыя прагназуе, што канчатковы паказчык будзе ў раёне 7—7,5 мільёнаў тонаў збожжа. Аднак, калі зыходзіць з простай прапорцыі, выходзіць меней. Калі палова плошчаў дала 3,5 млн тонаў, то 100 % плошчаў дадуць хіба 6,5—6,7 мільёнаў: на поўначы ўраджаі меншыя, а страты большыя.

**Зьміцер Панкавец**

## З ПОШТЫ РЭДАКЦЫІ

# «Падбусенская» немілагучная, а «Мікалаеўская» мілагучная

Пра перайменаваньні ў Берасьці.

З далучэньнем да Берасьця 11 падгародзкіх вёсак у горадзе дадалося 265 новых назваў вуліцаў. 173 зь іх супадалі з ужо існымі. Задача прыдумаць ім новыя назвы была ўскладзеная на галоўную спэцыялістку аддзелу культуры гарвыканкаму Алу Кондак. Яна кажа, што раілася з геадэзістамі, старшынямі сельсаветаў і мясовымі жыхарамі. У выніку ў былых вёсках — цяпер гэта пераважна катэджныя пасёлкі з заможным жыхарствам — будзе нямала вуліцаў у гонар праваслаўных сьвятых. У Плосцы зьявіцца вуліца Серафіма Сароўскага. У Аркадзіі — Сьвята-Афанасьеўская, па імені сьвятога Афанасія Філіповіча, які там быў забіты па падазрэньні ў шпіянажы на карысьць Расеі ў часе вайны ў сярэдзіне XVII стагодзьдзя.

А вось вуліцы Падбусенскай, як ні прасілі жыхары Плоскі, ня будзе. Маўляў, назва і немілагучная, і патрабуе паясьненьня. Назва тая была ад слова «бусел», на мясцовай гаворцы «бусён». Яна ў свой час атрымала назву ад таго, што праходзіла пад бусьлянкай, і вось цяпер яе ня будзе.

Затое будуць Мікалаеўская, Пятроўская, Георгіеўская, Надзеінская, Алая і іншыя назвы, якія, трэба думаць, «не патрабуюць тлумачэньня» для чыноўнікаў, у якіх па-ранейшаму Масква ў галаве.

**Толік Пекун, Берасьце**

# Радзіма Сухарэнкі застаецца ў перадавіках

Тры студэнты напісалі заяву ў інспэкцыю па падатках і зборах аб тым, што ў прыватным доме, дзе праходзіў купальскі канцэрт незалежных бардаў, стаяла скрыня для збору грошай.

Новыя тэхналёгіі ціску на апазыцыю традыцыйна апрацоўваюцца на Гомелі. На гэты раз там спрабуюць пакараць арганізатараў незалежнага бардаўскага канцэрту. Для гэтых мэтаў выкарысталі трох студэнтаў.

Арганізатараў канцэрту з удзелам беларускіх бардаў, які прайшоў у Гомелі на Купальле, падатковая інспэкцыя абвінавачвае ў незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасьці.

30 ліпеня справа разглядалася ў гаспадарчым судзе Гомельскай вобласьці. Як сьцьвярджае адна з арганізатараў канцэрту Ларыса Шчыракова і яшчэ сем чалавек, якія прысутнічалі на канцэрце, выступленьне бардаў — Зьмітра Бартосіка, Вальжыны Цярэшчанкі і Андрэя Мельнікава — праходзіла на грамадзкіх пачатках, грошай за канцэрт ніхто ня браў. У сваю чаргу прадстаўнік абласной інспэкцыі Міністэрства па падатках і зборах Андрэй Леўшуноў у якасьці доказу ажыцьцяўленьня прадпрымальніцкай дзейнасьці прывёў сьведчаньні трох студэнтаў Гомельскага ўнівэрсытэту Антона Яначкіна, Пятра Вялева і Станіслава Лапыкі. Гэтыя маладыя людзі напісалі заяву ў інспэкцыю па падатках і зборах аб тым, што ў прыватным доме, дзе праходзіў канцэрт, стаяла скрыня, куды трэ было класьці грошы.

Калі суд прызнае факт парушэньня, арганізатарам канцэрту пагражае штраф.

У часе разгляду судзьдзя Вікторыя Лапута зазначыла, што «скрыня — гэта не Ларыса Шчыракова, таму няма падстаў гаварыць аб тым, што менавіта яна брала грошы за выступленьне артыстаў». Тым больш што ў артыкуле аб незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасьці Кодэксу аб адміністрацыйных парушэньнях ідзе гаворка аб сыстэматычным атрыманьні даходу. У выпадку з арганізатарамі канцэрту такія факты не пацьвярджаюцца.

Далейшы разгляд справы заплянуваны на 9 жніўня. Назіральнікі заўважаюць, што гомельскія спэцслужбісты маюць рэпутацыю непераборлівых у сродках. У Гомелі найчасьцей выбухалі скандалы, зьвязаныя з вэрбоўкай людзей псыхічна няўстойлівых, а яшчэ студэнтаў шляхам шантажу.

Менавіта гомельскі супрацоўнік КДБ завэрбаваў Уладзя Міхайлава. Тамсама ў свой час спробамі вэрбоўкі быў даведзены да самагубства «зубровец» Зайцаў. У Гомелі ж — адзіны выпадак на ўсю краіну — пракуратура дала папярэджаньне журналістцы за працу на замежную радыёстанцыю. А моладзевых актывістаў актыўна цягалі на допыты, вінавацячы ў належнасьці да незарэгістраваных арганізацый. Дарэчы, працэнт галасоў «за» ў Гомельскай вобласьці нязьменна аказваецца найвышэйшым па краіне.

У выпадку з арганізатарамі канцэрту асаблівую агіду выклікае той факт, што атака скіраваная рыхтык супраць беларускае культуры і тых людзей, якія спрабуюць яе захаваць. Не абышлося ў гэтай справе і без «упраўленьня ідэалёгіі». Той купальскі канцэрт быў зладжаны ў прыватным доме. Дом культуры разарваў раней заключаную дамоўленасьць на яго правядзеньне.

**Мікола Бугай; інф. з Гомелю — БелаПАН**

# Пісалі на асфальце «За незалежную Беларусь!»

У Гомелі затрымалі пяць хлопцаў, якія ўвечары 27 ліпеня ў цэнтры гораду пісалі крэйдай на асфальце.

Гэта адбылося а 19.00 каля помніку Кірылу Тураўскаму на плошчы Леніна. Хлопцы пісалі ня проста так: яны хацелі нагадаць пра гадавіну прыняцьця Дэклярацыі аб сувэрэнітэце Беларусі. Аднак да іх падышлі людзі ў цывільным і запатрабавалі прайсьціць за імі.

Юнакоў завялі ў нейкі будынак каля мэдычнага ўнівэрсытэту і тамака дапыталі. Праз гадзіну хлопцаў адпусьцілі.

Мусіць, тэлефоны гэтых маладзёнаў праслухоўваліся, бо аднаго зь іх затрымалі ў той дзень двойчы. Удзень у іншай кампаніі ён маляваў бел-чырвона-белы сьцяг, таксама крэйдай, на Кіеўскім спуску ў цэнтральным парку Гомелю.

Са словаў сьведкаў, цэлы дзень цэнтар гораду быў напоўнены людзьмі ў штацкім, што туляліся з краю ў край і елі марозіва.

**Ул. інф.**

# Лідэр гомельскага РНЕ за кратамі

На 6 месяцаў арышту асудзіў суд 26-гадовага Міхаіла Якаўчука. Ён быў прызнаны вінаватым у «арганізацыі дзейнасьці незарэгістраванага грамадзкага аб'яднаньня» — ён спрабаваў стварыць у горадзе філію «Русского национального единства», шавіністычную арганізацыю. Уваходзіла ў суполку меней за 10 чалавек. Яшчэ адзін паплечнік Якаўчука хаваецца ад сьледзтва і абвешчаны ў вышук.

Беларускі Хэльсінскі камітэта выказаў пратэст, што па адным артыкуле судзяць патрыятычную моладзь з «Маладога фронту» і прадстаўнікоў арганізацыі, якая мае на мэце ліквідацыю Беларусі як дзяржавы.

**МБ**

# Дэфіцыт замежнага гандлю набывае беспрэцэдэнтны памер

**Працяг са старонкі 3.**

ва ніжэйшы за беларускі на 60%.

Нашмат большую небясьпеку мае тое, што сёньняшні эканамічны курс няздольны вывесьці краіну да сапраўднае шматвэктарнасьці.

У 1994 годзе на долю Расеі прыпадала 46% замежнага гандлю Беларусі, на краіны СНД — 12% і яшчэ 42% — на астатні сьвет. У 1998 годзе на Расею прыходзілася ўжо 67% замежнагандлёвага абароту. Дывэрсыфікацыю гандлю ўдалося наноў ажыцьцявіць урадам Ярмошына, Навіцкага, Сідорскага за 2000-2006 гады. Аднак толькі да пэўнай меры: краіна заставалася цалкам залежнаю ад імпарту расейскіх энэрганосьбітаў. І вось ізноў пачалася адваротная тэндэнцыя.

Яе можна зьвязаць перадусім з падзеньнем нафтавага экспарту Беларусі пасьля зьніжэньня падатковых ільготаў на экспарт расейскай нафты. Раней яе папросту рээкспартавалі праз Беларусь адкрыта або сукрыта — пасьля перапрацоўкі на «Нафтане» і Мазырскім нафтаперапрацоўчым. Менавіта з нафтавыміпературбацыямі зьвязанае радыкальнае падзеньне экспарту ў Нямеччыну сёлета — на 44% за першае паўгодзьдзе.

Гэтыя лічбы адбіваюць таксама непрыстасаванасьць беларускіх вытворцаў да канкурэнцыі на сусьветных рынках. А што здарыцца, калі Расея адменіць пратэкцыяністкі рэжым для нейкіх катэгорый беларускіх тавараў? Пэрспэктыва цалкам рэальная ў сьвятле далучэньня РФ да Сусьветнай гандлёвай арганізацыі.

У беларускім выпадку гэта тым больш адчувальна, што наш унутраны рынак малы, а гаспадарка экспартна- і імпартнаарыентаваная.

**Толькі лічбы Мінстату**

У Беларусі ў студзені–чэрвені 2007 году сальда замежнага гандлю таварамі склалася адʼемным у памеры $1793,4 млн. За чэрвень 2007 году яно вырасла на $342,7 млн. У студзені–чэрвені 2006 году адʼемнае сальда складала $927,9 млн.

Абʼём замежнага гандлю ў студзені–чэрвені 2007 году склаў $23222,8 млн. Імпарт тавараў вырас на 22,4% і склаў $12508,1 млн, экспарт пабольшаў на 15,3% і склаў $10714,7 млн.

Пры гэтым экспарт у Расею вырас на 28,7% і склаў $3935,0 млн, ва Украіну — на 15,5% да $575,8 млн. Экспарт па-за СНД павялічыўся толькі на 5,3% і склаў $5777,4 млн. Экспарт у Германію зьнізіўся на 43,8% і склаў $229,7 млн.

Абʼём імпарту з Расеі вырас на 16,1% і склаў $7271,7 млн. Імпарт з Украіны узрос на 35% і дасягнуў $695,9 млн. З краінаў па-за СНД Беларусь нарасьціла імпарт на 31,2% да $4406,9 млн. Імпарт з Германіі ўзрос у 1,5 разу і склаў $1019,1 млн.

Плянам на 2007 год вызначалася задача давесьці сальда замежнага гандлю да плюс $500 млн.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Падзеньне экспарту нафтапрадуктаў зьнізіла даходы Беларусі.**

## «Мотавела» аддадуць аўстрыйцам

Аўстрыйская фірма «ATEC Holding Gmbh» у 2007—2011 гадах набудзе акцыі ААТ «Мотавела» на 15,6 млрд. рублёў. Адпаведнае рашэньне ўтрымліваецца ва ўказе прэзыдэнта №354 ад 26 ліпеня.

Ва ўласнасьць аўстрыйцам пяройдуць усе акцыі, што належаць дзяржаве, — 99,7%; Аплата будзе ажыцьцяўляцца з 1 студзеня 2008 году роўнымі долямі штогод па 3,1 млрд. рублёў.

Фірма таксама аплаціць пазыкі прадпрыемства і заінвэстуе ў яго ў ня менш чым $20 млн. Пры гэтым фірма абавязуецца захаваць спэцыялізацыю заводу і гандлёвую марку.

Фірме «АТЕС» ужо належыць шклозавод «Ялізава» — найбуйнейшае ў Беларусі прадпрыемства шкляной галіны. «АТЕС» таксама мае інвэставаць у завод па вытворчасьці кальцынаванай соды пад Мазыром.

**МБ**

## СЬЦІСЛА

### «Эўрасетка» пагражае сыходам

Генэральны дырэктар беларускага філіяла «Еўрасеткі» — найбуйнейшага сотавага рэтэйлера ў СНД — Алесь Мухін не выключае сыходу кампаніі з рынку Беларусі. У Беларусі ад высокіх падаткаў і вялікай долі «шэрага» імпарту падае рэнтабэльнасьць. За апошні час мясцовы падатак з продажу павялічаны з 5 да 15%. Апрача таго, у цане законна імпартаванага мабільніка да 7% складаюць затраты на нанясеньне кантрольных знакаў

### Прадпрымальнікаў 200 тысяч

Колькасьць індывідуальных прадпрымальнікаў у Беларусі на 1 ліпеня склала 200,4 тыс. З пачатку году яна вырасла на 8,6 тыс. чалавек, або на 4,5%. Сума падатковых выплатаў ад прадпрымальнікаў за студзень-чэрвень склала Br340,5 млрд.

### Арэнда кватэраў даражэе

У апошнія дні ліпеня традыцыйна ўзьнікае ажыятажны попыт на жыльлё з боку іншагародніх. Гэта студэнты шукаюць сабе кватэры на новы сэзон. Мінімальная цана найму аднапакаёўкі ў сталіцы складае цяпер $200 плюс аплата камунальных паслуг. Двухпакаёвыя кватэры каштуюць цяпер ад $240—250 за месяц. Сярэдні кошт стандартнай трохпакаёўкі дасягае 280—300 долараў.

### Стаўка рэфінансаваньня зьніжаная

Нацбанк панізіў з 1 жніўня стаўку рэфінансаваньня яшчэ на 0,25% — да 10,5% гадавых. Зьмяншэньне стаўкі рэфінансаваньня панізіць кошты крэдытаў для насельніцтва і прадпрыемстваў.

**МБ**

# Эніра Браніцкая: Вельмі расчараваная «Нашай Нівай»


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Былая палітзьняволеная Эніра Браніцкая зьмясьціла на сайце «Нашай Нівы» nn.by такі камэнтар:

«Вельмі расчараваная «Нашай Нівай». Надрукаваць інтэрвію з Сухарэнкам ды яшчэ й паставіць у газэту ягонае фота з унукам... Проста новы герой, няшчасны звольнены генэрал, які нарэшце атрымаў магчымасьць пабыць з унукам. Праз гэтага «героя» сапраўды добрыя людзі не пабачылі, як нараджаюцца іх дзеці, гробілі сваё здароўе, ня кажучы пра здароўе пажылых бацькоў.

Давайце яшчэ абвесьцім акцыю: напішы ліст Сухарэнку — і павіншуй яго з днём народзінаў... Сумна, як хутка мы ўсё забываем».

Эніра Браніцкая адседзела паўгоду на Валадарцы паводле абвінавачаньня ў дачыненьні да незарэгістраванай арганізацыі «Партнэрства» (сумнавядомая справа ад дохлых пацуках).

**Рэд.:** Малое ўдакладненьне: мы не друкавалі інтэрвію, мы надрукавалі яго аналіз з цытатамі асобных выказваньняў. Здымак сапраўды ставілі і ўвагу на сытуацыю Сухарэнку зьвярталі. Сэнс і наступствы палітычнай кампаніі па чыстцы КДБ, разгорнутую Лукашэнкам, не зразумець бяз гэтага.

Рэпліка Э.Браніцкай — асобы, якая з выключнай мужнасьцю паводзіла сябе ў турме і мае маральнае права голасу ў такой справе — выклікала шквал чытацкіх водгукаў (агулам каля 100 камэнтароў на момант здачы нумару ў друк). Падаем некаторыя зь іх, а таксама рэакцыю Аляксандра Класкоўскага зь ягонага блогу. Мы таксама папрасілі спн.Браніцкую падсумаваць дыскусію.

**Філёляг-самавук** напісаў(ла) Ліпень 27, 2007 у 15:04

Можна зразумець стаўленьне да аўтара «дохлых пацукоў» з боку дзяўчыны, якая пацярпела. Але няўжо мы хочам, каб «НН» была як «СБ наадварот»: друкаваць толькі тое, што «ў рэчышчы генеральнай лініі»? Ад плюралізму бяды ня будзе.

**Jan Dvor** напісаў(ла) Ліпень 27, 2007 у 19:31

Мы жывем у варунках інфармацыйнае вайны. Безумоўна, трэба камэнтаваць інтэрвію «апрычніка», але паказваць нелюдзяў у звычайных людзкіх сытуацыях (з здымачку з унукам) — ня справа незалежнае беларускае газэты.

**Ales' Jurkaviec** напісаў(ла) Ліпень 27, 2007 у 19:36

Аўдыторыя НН — не малапісьменныя людзі, якія сваёй галавой думаць ня ўмеюць і толькі бескрытычна ўспрымаюць любое друкаванае слова. Сухарэнка сказаў тое, што палічыў патрэбным, выказаў сваю думку, яе надрукавалі. Хай чытачы самі робяць з гэтых слоў высновы. І дзякуй «Народнай волі» і «Нашай ніве», што гэтую інфармацыю далі.

**ФГ** напісаў(ла) Ліпень 27, 2007 у 23:09

Ставіць крыж на любым жывым чалавеку. нават калі ен і моцна правініўся перад сваім народам, не гуманна і не па–боску. Бо хто з нас без граху?

**Vasil'** напісаў(ла) Ліпень 28, 2007 у 0:07

Lichu, lepei chym pra Stepu NN pavedamila b pra Elviru i yae partnerau, yakia patyarpeli ad KGB.

**Пятрусь** напісаў(ла) Ліпень 28, 2007 у 10:04

Ніякага палітычнага сэнсу няма ў тым, каб газета авечак друкавала інтэрв'ю з ваўкамі... Атрымоўваецца, што авечкі змагаюцца не за свой палітычны інтарэс, а гатовыя палегці, баронячы абстрактны плюралізм...

**klv** напісаў(ла) Ліпень 30, 2007 у 13:19

Што Вы знайшлі прывабнага у гэтым інтэрв'ю і на фота? У такім выглядзе няшчасныя корпаюцца у сметніках. А узровень ягоных разваг — бурса нейкая.

# Чаму намалявалі бяз рог?

Стаўленьне Браніцкай да былога шэфа КГБ можна зразумець. Аднак гаворка і пра іншае — прынцыпы дзейнасьці мэдыяў. Піша **Аляксандар Класкоўскі**.

У вайну савецкія газэты малявалі немцаў з рагамі. Потым фільм са Штырліцам меў сэнсацыйны посьпех яшчэ і таму, што народ убачыў псыхалягічныя партрэты слугаў гітлераўскага рэжыму.

Публікацыі карэспандэнтаў «Народнай волі» пасьля наведваньня вёскі Здудзічы (акрамя інтэрвію з былым шэфам спэцслужбы, я маю на ўвазе яшчэ і замалёўку пра бацькоў Рыгора Кісяля), а таксама наступны камэнтар у «НН» высьвечваюць важную акалічнасьць. А менавіта: і Сухарэнка, і Кісель, як і сам Лукашэнка — гэта не дэманічны дэсант іншаплянэтнікаў. Тутэйшыя, з простых сем’яў. Зусім такія, як мы!

Удумлівай публіцы гэта дае штуршок да роздуму аб парадоксах і заканамернасьцях нашай найноўшай гісторыі, стане грамадзтва, шляхах пераадоленьня анамаліяў. Калі адмовіцца ад дэманізацыі, адразу ўзьнікае процьма складаных пытаньняў! Ну а ў кагосьці — толькі адно пытаньне: чаму гэта прадстаўнікоў «злачыннага рэжыму» намалявалі бяз рог?

Утылітарысцкі падыход да мэдыяў сто гадоў таму выклаў Ленін. Некаторыя сёньняшнія дыскутанты нават не падазраюць, што проста


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

капіююць яго. Праца «Партыйная арганізацыя і партыйная літаратура» (пад літаратурай тут маецца на ўвазе менавіта журналістыка): «Далоў літаратараў беспартыйных! Далоў літаратараў звышчалавекаў! Літаратурная справа мусіць стаць часткай агульнапралетарскай справы, «колцам ды шрубкай» аднаго-адзінага, вялікага сацыял-дэмакратычнага мэханізму, што прыводзіцца ў рух усім сьвядомым авангардам усяе працоўнай клясы».

А цяпер некалі тэарэтычных тэзаў.

Канешне, поўнай адстароненасьці не бывае. Выданьне ня мусіць быць сьметнікам. Пэўны кірунак — гэта нармалёва. Плюралізм складаецца з гамы мэдыяў, а не зь вінэгрэту ў асобнай газэце. І разам з тым — гэта выразна паказвае досьвед разьвітых дэмакратыяў —аўтарытэтнымі становяцца тыя выданьні, якія, хай сабе маючы пэўнае палітычнае адценьне, імкнуцца да шырокага асьвятленьня і ўзважанага камэнтаваньня падзеяў, а ня ставяць вышэй за ўсё накіданьне пэўнай ідэялёгіі. Так, у Францыі шырока разыходзяцца памяркоўна-кансэрватыўная «Монд», умерана-лібэральная «Лібэрасьён». І разам з тым ціха памірае са сваім непазбыўным чырвоным кляймом «Юманітэ».

Зайдзеце на сайты некаторых партыяў ці асобных палітычных пасіянараў — і адчуйце розьніцу паміж прапагандай ды прафэсійнай журналістыкай.

За апошнія гады ўсё больш журналістаў зразумелі, што праца СМІ мусіць будавацца не паводле апазыцыйных стратэгіяў, а паводле мэдыйных законаў. Дайце веры прафэсіяналам!

# Эніра Браніцкая. P.S.

Свой камэнтар я напісала, каб мяне пачула рэдакцыя НН. Зусім не чакала такой шырокай рэакцыі і зусім не хацела навязваць каму-небудзь сваё меркаваньне.

Напэўна, лягічна было б цяпер напісаць што-небудзь прымірэнчае, што ЎСЕ мы людзі, і што ёсьць законы мэдыяў, і НН павінная імкнуцца быць аб’ектыўным выданьнем, і што я ўспрыняла ўсё дастаткова асабіста... І ўсё гэта праўда, з аднаго боку, але я не памяняла свайго меркаваньня.

Шмат было пра тое, што і Бог судзьдзя, і падставіць другую шчаку, але для ўсяго ёсьць межы. Калі мы будзем працягваць так «падстаўляцца», то раней ці пазьней нас проста заб’юць, у прамым і пераносным сэнсе. Што я ведаю пра Сухарэнку? Ведаю, што падчас яго ўзначальваньня вельмі многія людзі па незразумелых прычынах сталі пагражаць нацыянальнай бясьпецы – студэнты ВНУ, сябры розных грамадзкіх аб’яднаньняў, усе жыхары краіны, якім у жывым эфіры пагражалі саліднымі тэрмінамі ці магчымасьцю біць забітымі ці атручанымі нейкімі тэрарыстамі. Далёка не для ўсіх стасункі з супрацоўнікамі КГБ скончыліся памысна.

Гісторыя з пацукамі была прыдуманая толькі для ўсіх вас, у нашай крымінальнай справе пра гэта не было ні слова.

Мы ўсе часам стамляемся змагацца, і хочам проста жыць, і многія рэчы гатовыя даравацьі забыць. Але далёка ня ўсё павінна заставацца беспакараным і забытым...

Можа, абвесьціць акцыю – напішы ліст Сухарэнку? Пра зьмест кожны вырашыць самастойна.

# Мік Джагер: «Жыве Беларусь!»



**У Варшаве прадстаўнікі беларускага «Свабоднага тэатру» сустрэліся зь легендарным музыкам, лідэрам гурту Rolling Stones Мікам Джагерам. Музыка заявіў, што ён цікавіцца сытуацыяй у Беларусі, і Беларусь, на яго думку, павінна стаць свабоднай эўрапейскай краінай.**
**У гутарцы Мік Джагер паабяцаў падтрымку ў рэалізацыі беларускіх музычных і культурніцкіх праектаў. Напрыканцы сустрэчы Мік Джагер разьвітаўся словамі: «Жыве Беларусь!».**
**У Варшаве славуты рок-гурт даваў канцэрт.**

**Хартыя'97; фота Андрэя Лянкевіча**

## Свабода да апошняга дыханьня

Гэтая кніга распавядае пра беларускія магілкі. Два гады Вольга Іпатава наведвала нэкропалі, дзе пахаваныя беларускія дзеячы: палітыкі, рэвалюцыянэры, інтэлігенты. Вынікам паездак сталі больш чым 40 нарысаў.

У кнізе зьмешчаныя нарысы пра Ўладзіслава Сыракомлю і вечнага вандроўніка Язэпа Драздовіча, Алеся Адамовіча і Паўлюка Багрыма, Міхала Валовіча і Франца Аляхновіча, Янку Журбу і Аляксея Карпюка, паўстанцаў 1794 і 1863 гадоў, Тамаша Ваўжэцкага і кс.Уладзіслава Чарняўскага. Пра тых, чые сапраўдныя ці сымбалічныя магілы (як Антона Луцкевіча) ёсьць у Беларусі ці на літоўскай Віленшчыне. Асобныя разьдзелы прысьвечаныя Вільні, беларускаму нэкропалю ў Іст-Брансьвіку (ЗША), пахаваньням у Канадзе.

Каштуе 4 800 руб.

**АГ**

**Вольга Іпатава. Свабода да апошняга дыхання:** аповеды пра падарожжы. Менск: Кнігазбор, 2007. — 184 с.

## СЬЦІСЛА

### У Міры зьявіцца экспазыцыя радзівілаўскіх мапаў

Музэефікацыю Мірскага замку плянуецца завяршыць у 2009 годзе. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведаміў дырэктар Мастацкага музэю Ўладзімер Пракапцоў. Замак у Міры — гэта філія музэю. Ідуць перамовы аб перадачы для экспазыцыі копіяў радзівілаўскіх мапаў, якія ў свой час былі вывезеныя зь Беларусі расейскімі войскамі і захоўваюцца ў Расейскай дзяржаўнай бібліятэцы.

### Лявон Вольскі распачаў блог

У сваім інтэрнэт-дзёньніку ён піша пра падзеі свайго жыцьця, музычныя праекты. І перамаўляецца зь сябрамі. За два дні ў Вольскага зьявілася больш за сотню «фрэндаў»! Бліжэйшым часам у дзёньніку Вольскага будуць ня толькі канцэртныя справаздачы, але зьявіцца і комікс, які Лявон рабіў для «Нашай Нівы». Свае інтэрнэт-дзёньнікі маюць таксама Руся, Слава Корань, Кrou, Янка Маўзэр, Зьміцер Вайцюшкевіч.

### Бібліятэкі не замаўляюць бел.літ.

Сёлета школьныя бібліятэкі не замовілі ніводнага праграмнага твору па беларускай літаратуры. Пра гэта паведаміў на прэс-канфэрэнцыі 25 ліпеня дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Ўладзіслаў Мачульскі.

### Помнік Янку Брылю зьявіцца ўвосень

25 ліпеня споўніўся год, як ня стала народнага пісьменьніка Беларусі Янкі Брыля. Неўзабаве на магіле паўстане сьціплы помнік. Сябар сям'і Брыля Анатоль Сідарэвіч кажа: «Дзяржава ніякага дачыненьня да ўстаноўкі помніку ня мае. Граніт для помніку прывезены з Житомірскай вобласьці. Гэта будзе сьціплы помнік без усялякіх барэльефаў, гарэльефаў». Сёлета 4 жніўня Івану Антонавічу споўнілася б 90 гадоў.

**МБ; generation.by, svaboda.org**

## 24 ліпеня

### У Жлобіне не дазваляюць

У шасьці гарадах Беларусі актывісты прафсаюзу **працаўнікоў радыёэлектроннай прамысловасьці (РЭП)** падалі заяўкі на правядзеньне сацыяльных пікетаў супраць адмены льгот. Стала вядома, што гарвыканкам Жлобіна ня даў дазвол на акцыю.

### Напярэдадні 27 ліпеня

Суд Цэнтральнага раёну Менску асудзіў моладзевага апазыцыйнага актывіста **Валянціна Сакалоўскага** на 10 сутак арышту. Яго абвінавацілі ў дробным хуліганстве. Суд Цэнтральнага раёну Менску вынес вырак затрыманаму актывісту **Аляксандру Чарнышову** — 15 сутак арышту. Савецкі суд пакараў 10-ю суткамі затрыманага напярэдадні **Сяргея Клюева**. Судзьдзя Савецкага раёну **Людміла Савасьцян** вынесла такое пакараньне за «заклікі да правядзеньня несанкцыянаванай акцыі». Акрамя таго, супрацоўнікі міліцыі затрымалі **Кацю Сухардзінаву** і яе сяброўку **Марыю Серую**, за расклейваньне налепак з заклікам да ўдзелу ў мерапрыемствах апазыцыі ў Дзень незалежнасьці — 27 ліпеня. Суд Савецкага раёна прызнаў дзяўчат вінаватымі па артыкуле 17.1 Адміністратыўнага кодэксу Беларусі («дробнае хуліганства») і аштрафаваў Кацярыну Сухардзінаву на 30 базавых велічынь, Марыю Серую — на 20 базавых велічынь.

### Шчукіну пакінулі

Быў адхілены пратэст дзяржаўнага абвінаваўцы адносна прысуду праваабаронцу **Валер'ю Шчукіну**. Нагадаем, 8 чэрвеня Першамайскі раённы суд Віцебску вынес прысуд Шчукіну — штраф 40 базавых велічынь. Яго прызналі вінаватым у артыкуле 189 КК «Абраза членаў і работнікаў выбарчых камісіяў).

## 25 ліпеня

### Пасадзілі Шыдлоўскага

Суд над затрыманымі 24 ліпеня актывістамі **Паўлам Бараноўскім** і **Аляксеем Шыдлоўскім** быў перанесены на 8 жніўня. Удзень Аляксея Шыдлоўскага затрымалі паўторна, да яго дадому прыехалі міліцыянты, дзе і адбылося затрыманьне. Вечарам судзьдзя Партызанскага раёну **Алена Ціцянкова** прызначыла пакараньне Аляксею Шыдлоўскаму ў выглядзе 15 сутак арышту.

### ЗША асуджаюць

ЗША рашуча асуджаюць палітычна матываванае зьняволеньне палітычных актывістаў **Паўла Севярынца** і **Аляксея Шэіна**, якім улады вынесьлі 24 ліпеня прыгавор за распаўсюджваньне ўлётак пра мітынг Аб'яднаных дэмакратычных сіл, заплянаваны на 27 ліпеня.

### Івашкевіча папярэджвалі

Старшыня аргкамітэту па сьвяткаваньні 27 Ліпеня намесьнік старшыні Партыі БНФ **Віктар Івашкевіч** быў выкліканы ў галоўнае ўпраўленьне ўнутраных справаў Мінгарвыканкаму. Івашкевіча папярэдзілі аб крымінальнай адказнасьці ў выпадку правядзеньня 27 ліпеня ў Менску масавых акцый.

## 26 ліпеня

### У Лукашова тое самае

Прысуд у дачыненьні **Кастуся Лукашова**, брата вядомага палітыка Вячаслава Сіўчыка, пакінуты бязь зьменаў (два гады ўмоўна). Такое рашэньне прыняў 26 ліпеня суд Ленінскага раёну Менску.

### Мірон у гонар Плешчанкі

Мінулай ноччу на ўсіх жылых дамах па цотным баку вуліцы імя Валянціны Церашковай у Віцебску былі прымацаваныя шыльды **«Вуліца імя Ўладзімера Плешчанкі»**.

### Лукасіку не дазволілі

Калегія Менскага абласнога суду пакінула ў сіле рашэньне суду Мядзельскага раёну пра высылку з краіны пастара эвангельскай царквы «Ян Прадвесьнік» **Яраслава Лукасіка**.

### У Наваполацку пікеты

Наваполацак стаў адзіным на сёньняшні дзень горадам у краіне, у якім улады дазволілі пікет у падтрымку былога кандыдата на прэзыдэнты, а цяпер палітвязьня, **Аляксандра Казуліна.**

## 27 ліпеня

### Эўрасаюз у абарону Севярынца

Эўракамісар па замежных зносінах і палітыцы добрасуседзтва Бэніта Фэрэра-Вальднэр заявіла, што ўстрывожаная арыштамі і затрыманьнямі некалькіх удзельнікаў беларускай дэмакратычнай апазыцыі за апошні час, у тым ліку **Паўла Севярынца** і **Аляксея Шэіна**.

### Зноў Мірон

Бел-чырвона-белы сьцяг зьявіўся на даху дома №41 па праспэкце Фрунзэ ў Віцебску. У суседнім будынку пад нумарам 41А месьціцца Віцебскае абласное ўпраўленьне Міністэрства ўнутраных справаў.

### Акцыя 27 ліпеня

Недалёка ад Чырвонага касьцёлу быў затрыманы лідэр АГП **Анатоль Лябедзька**. Таксама затрымалі і **Віктара Івашкевіча**, але праз некаторы час абодвух палітыкаў адпусьцілі.

### У гальштуку, а брыдкасловіў

Моладзевы актывіст **Зьміцер Хведарук** судом Маскоўскага раёну Менску быў асуджаны да 10 сутак арышту. Хлопца затрымалі 26 ліпеня і абвінавацілі ў брыдкаслоўі.

### Упершыню на сутках

Ленінскі раённы суд Менску асудзіў на 15 сутак арышту **Яраслава Грышчэню**, ён быў затрыманы 27 ліпеня і меў пры сабе ўлёткі з заклікам прыйсьці на сустрэчу з дэпутатамі Вярхоўнага Савету 12-га скліканьня, якія прымалі Дэклярацыю аб дзяржаўным сувэрэнітэце Беларусі. Пакаралі юнака за «нецэнзурную лаянку». **Франака Вячорку** суд Завадзкога раёну пакараў 7 суткамі арышту за распаўсюджваньне ўлётак. Абодва хлопцы ўпершыню трапілі на суткі.

**ЗП**

**БЕЛ-ЧЫРВОНА-БЕЛЫ НА СЬВЯТОЙ ГАРЫ**

**Актывісты грамадзянскай кампаніі «Джынс за Свабоду» адзначылі Дзень абвяшчэньня сувэрэнітэту. Ранкам дзесяць чалавек выехалі зь Менску да Сьвятой гары, якая зьяўляецца вышэйшай кропкай Беларусі. Там быў замацаваны шасьціметровы флягшток. Пасьля быў узьняты бел-чырвона-белы сьцяг.**




CHARTER97.ORG

# Акадэмікі супраць царкоўнікаў

Выступ дзесяці акадэмікаў супраць Расейскай праваслаўнай царквы: камэнтуе **Віталь Тарас**.

На пачатку сёлетняга году «Советская Белоруссия» надрукавала артыкул акадэміка Рубінава «Навука і грамадзтва». Артыкул выклікаў гучны розгалас у незалежных СМІ і крыўду ў царкоўных колах. Так, мітрапаліт Філарэт выказаў абурэньне тым, што галоўны прэзыдэнцкі ідэоляг спрабуе абмежаваць месца Праваслаўнай царквы «больніцай і турмой».

І вось нядаўна ў расейскім інтэрнэце зьявіўся адкрыты ліст дзесяці расейскіх акадэмікаў прэзыдэнту Пуціну пра пагрозу клерыкалізацыі грамадзтва. Найбольшае апасеньне навукоўцаў выклікала імкненьне РПЦ увесьці ў сярэдніх школах, па сутнасьці, Закон Божы.

## Хто падпісанты?

Рэакцыя з боку царквы і расейскай праваслаўнай грамадзкасьці была куды больш рэзкай, чымся ў выпадку з Рубінавым. Так, прадстаўнік Маскоўскай партыярхіі протаярэй Усевалад Чаплін назваў ліст акадэмікаў даносам і заклікаў «разьвянчаць хімэру так званага навуковага сьветапогляду». А праваслаўная арганізацыя «Народны сабор» падала ў суд на аднаго з акадэмікаў — Нобэлеўскага ляўрэата Віталя Гінзбурга — за распальваньне рэлігійнай варожасьці. Падставаю стала фраза акадэміка ў адным з ранейшых інтэрвію, дзе той заявіў, што царкоўнікі, выкладаючы рэлігію, «хочуць завабіць душы дзяцей». Прытым ён назваў царкоўнікаў «сволачамі».

(Цікава, што цалкам ліст акадэмікаў знайсьці ў рунэце ня так проста — некалькі папулярных інфармацыйных сайтаў толькі цытавалі згаданы ліст, спасылаючыся пры гэтым адно на аднаго. Нарэшце мне ўдалося яго знайсьці на сайце atheism.ru, паводле якога і буду гэты дакумэнт цытаваць — В.Т.)

Між тым, і акадэмік Рубінаў пісаў пра небясьпеку пранікненьня рэлігіі ў сфэру дзяржаўнай адукацыі. Але ж на гэтым падабенства ягонага артыкулу зь лістом акадэмікаў і сканчваецца. Занадта розны ўзровень дыскусіі зададзены. Расейскія навукоўцы не выступаюць супраць рэлігіі як такой, але супраць парушэньня прынцыпаў сьвецкай дзяржавы, замацаваных у канстытуцыі. «Верыць ці ня верыць у Бога — справа сумленьня і перакананьняў кожнага чалавека. Мы паважаем пачуцьці вернікаў і ня ставім на мэце барацьбу з рэлігіяй. Але мы ня можам заставацца абыякавымі, калі робяцца спробы паставіць пад сумнеў навуковыя Веды, вытравіць з адукацыі «матэрыялістычнае бачаньне сьвету», — пішуць пры канцы свайго пасланьня расейскія акадэмікі. Ва ўсялякім разе яны не заклікаюць да замены рэлігійных догмаў на дзяржаўную ідэалёгію і ня ставяць на адну дошку, адрозна ад беларускага акадэміка, рэлігію і нацыяналізм.

Дый тое варта зазначыць, што імя акадэміка Рубінава ня надта вядомае ў шырокіх колах. У той час як імёны большасьці падпісантаў згаданага ліста вядомыя ва ўсім сьвеце. Дадатковую цікавасьць да яго, дарэчы, выклікае той факт, што пад ім стаіць подпіс ляўрэата Нобэлеўскай прэміі па фізыцы за 2000 год Жарэса Алфёрава — нараджэнца Віцебску, ганаровага грамадзяніна Менску, віцэ-прэзыдэнта РАН, які (рэдкі выпадак) ганарыцца тым, што паходзіць зь Беларусі. Савецкі навуковец Алфёраў вядомы яшчэ й сваімі досыць савецкімі поглядамі. Ён не аднойчы публічна выступаў у падтрымку Аляксандра Лукашэнкі падчас прэзыдэнцкіх выбараў у Беларусі.

Але ў дадзеным выпадку меркаваньне знакамітага нашага суайчыньніка дзяржаўныя СМІ, выглядае, не зацікавіла. Занадта высокую плянку для размовы, пэўна, задалі навукоўцы, занадта непрыемных для дзяржавы рэчаў тычыцца іх ліст.

Усе «падпісанты» — вядомыя навукоўцы ў галіне фізыкі, астрафізыкі, генэтыкі і г.д. І хоць пратаярэй Чаплін назваў іх «пэнсіянэрамі», праігнараваць іх думку не выпадае.

Можна пагадзіцца з тым, што сама форма — зварот да вышэйшай асобы дзяржавы — нагадвае савецкі час, калі акадэмікі, у іх ліку акадэмік Сахараў, да прыкладу, пісалі лісты на актуальныя тэмы асабіста генэральнаму сакратару ЦК КПСС Брэжневу. Але што зробіш, калі цяперашняя сыстэма ўлады ў Расеі, гэтак добра вядомая й беларусам «вэртыкаль улады» на вачох ператвараецца ў замкнёную, амаль што гэрмэтычную сыстэму, дзе ўсё трымаецца на «харызьме» аднаго вышэйшага начальніка. І пры якой зьвяртацца да чыноўнікаў альбо царкоўных ярархаў на якім заўгодна ўзроўні аднолькава ня мае сэнсу, бо не пачуюць. Не для дыскусіяў гэтая сыстэма ствралася.

## Што дазволена РПЦ...

Варта нагадаць, між іншым, што Расейская акадэмія навук зь яе «пэнсіянэрамі» ды «рэтраградамі», засталася ці не апошняй выспай вальнадумства і дэмакратыі — як на яе ні ціснe крамлёўская адміністрацыя, а з прызначэньнем акадэмікаў, а таксама зьнешніх «куратараў», якім ня церпіцца дарвацца да ўласнасьці РАН, акадэмікі свой статут і высокі грамадзкі статус захавалі. (Які кантраст зь ведамствам Мясьніковіча, у якое ператварылася НАН РБ.)

І тут варта працытаваць той фрагмэнт, які ўпарта прапускаўся ў першых публікацыях ліста і які пралівае сьвятло на сутнасьць рэакцыі Праваслаўнае царквы: «Між іншым, Каталіцкая царква практычна цалкам адмовілася ад умяшаньня ў справы навукі (у 1992 годзе яна нават прызнала сваю памылку ў справе Галілея і «рэабілітавала» яго). У гутарцы з акадэмікам Арнольдам (сакавік 1988 г.) Папа Ян Павал II прызнаў, што навука адна здольная знайсьці ісьціну, а рэлігія, паводле пантыфіка, лічыць сябе больш кампэтэнтнай у ацэнцы магчымага выкарыстаньня навуковых адкрыцьцяў. Наша РПЦ трымаецца іншага пункту погляду: «Неабходны дыялёг улады і грамадзтва для таго, каб манаполія матэрыялістычнага бачаньня сьвету, якая склалася за савецкім часам, нарэшце скончылася ў расейскай адукацыйнай сыстэме» (з рэзалюцыі Сабору).

І далей: «У эўрапейскай супольнасьці,

дзе міжканфэсійная варажнеча ўжо выявілася ва ўсёй красе, пасьля працяглых абмеркаваньняў прыйшлі да высновы аб неабходнасьці ўвядзеньня ў школах курсу гісторыі асноўных монатэістычных рэлігіяў. Асноўны довад палягае на тым, што знаёмства з гісторыяй і культурнай спадчынай іншых канфэсіяў будзе спрыяць паляпшэньню ўзаемаразуменьня паміж прадстаўнікамі розных нацыянальнасьцяў і рэлігійных перакананьняў. Нікому да галавы не прыйшло, да прыкладу, патрабаваць увядзеньня «Асноваў каталіцкай культуры».

Калі меркаваць па водгуках на шматлікіх форумах у расейскім сеціве, найбольшае абурэньне праваслаўнай грамадзкасьці выклікалі менавіта спасылкі на Каталіцкі касьцёл і іншыя «монатэістычныя рэлігіі». «Вось дзе сабака зарыты! — радуюцца адэпты Праваслаўнае царквы. — Нашая царква акадэміку Гінзбургу не падабаецца, а сынагога яму падабаецца!» (І нават прыводзяць прыклады, калі акадэмік, ня будучы юдэем, ахвяраваў нешта на храмы ў Ізраілі. Так дыскусія, яшчэ як сьлед не пачаўшыся, скацілася да прымітыўнага антысэмітызму.) Як жа пасьмелі акадэмікі параўнаць Расейскую праваслаўную царкву і каталіцкі касьцёл і іх ролю ў жыцьці дзяржавы?

За адказам на гэтае рытарычнае пытаньне зьвернемся зноў да тэксту ліста: «…Сабор лічыць, што вывучэньне школьнікамі «Асноваў праваслаўнае культуры» неабходнае ў нашай дзяржаве, дзе праваслаўныя складаюць абсалютную большасьць насельніцтва». Калі лічыць атэістаў расейскай нацыянальнасьці пагалоўна праваслаўнымі, дык большасьць, напэўна, выйдзе. А вось калі без атэістаў, дык, на жаль, праваслаўныя апынуцца ў меншасьці. Ну, ды справа ня ў гэтым. Хіба можна так грэбліва ставіцца да іншых канфэсіяў? Ці не нагадвае гэта праваслаўны шавінізм? Урэшце, няблага было б праваслаўным ярархам задумацца, куды вядзе такая палітыка: да кансалідацыі краіны ці дае яе развалу.

Вось такога «прыніжэньня» ролі праваслаўнай рэлігіі царква, зразумела, дараваць не магла. Як гэта нехта можа сумнявацца ў тым, што толькі яна, РПЦ, можа стаяць ля самаўладцы, то бок прэзыдэнта, і вызначаць духоўнае жыцьцё яе падданых у Расеі?

Пры гэтым яе ярархі не задумваюцца ці робяць выгляд, што не заўважаюць адной акалічнасьці. Калі дзяржаўныя чыноўнікі, у тым ліку першыя асобы ў дзяржаве, прыходзяць у царкву па вялікіх царкоўных сьвятах і стаяць там перад тэлекамэрамі са сьвечкамі альбо выступаюць у храме з трыбуны — гэта толькі дыскрэдытуе і Царкву і дзяржаву.

## Акадэмікі — не героі

У нечым акадэмікі, трэба прызнаць, падставіліся для крытыкі. Напрыклад, нежаданьне прызнаць тэалёгію навуковай дысцыплінай (пры тым што ўсе буйныя ўнівэрсытэты на Захадзе маюць тэалягічныя факультэты або аддзяленьні) гаворыць аб пэўнай вузкасьці мысьленьня навукоўцаў, чые матэрыялістычныя погляды сфармаваліся пераважна за савецкім часам. Настойваць на тым, як гэта робяць акадэмікі, што ўсе навуковыя дасягненьні сучаснасьці заснаваныя на матэрыялізьме, выглядаюць наіўнымі. Асабліва калі ўспомніць Ньютана ці Айнштайна, якія, кожны па-свойму, глыбока верылі ў Бога. Апрача таго, увогуле падзел усіх разнастайных поглядаў і навуковых мэтадаў на «матэрыялізм» і «ідэалізм», з гледзішча сучаснай філязофіі, выглядае, мякка кажучы, спрошчаным. Гэта, хутчэй, адпавядае Кароткаму курсу гісторыі ВКП(б).

Акрамя атэістаў, напрыклад, ёсьць жа яшчэ й агностыкі, а сярод вернікаў — сатаністы...

Павінен чалавек у нешта верыць, ці ён павінен, найперш, імкнуцца разумець, каб адказваць за свае ўчынкі, — гэтае пытаньне выходзіць далёка за рамкі тэмы, і абмяркоўваць яго тут няма сэнсу. Як няма сэнсу даводзіць каму-небудзь, што ён верыць ня ў тое ці няправільна. Гэта нагадвае клясычную дыскусію, апісаную яшчэ Ільфам і Пятровым: «Бога няма, — сказаў Астап. — Ёсьць-ёсьць! — адказалі ксяндзы».

Але пафас ліста акадэмікаў палягае на нежаданьні прыняць хрысьціянскую рэлігію, ды яшчэ ў яе спэцыфічна праваслаўнай форме, у якасьці адзінай культурніцкай мадэлі, якая адсякае ўсе астатнія мадэлі як бездухоўныя і варожыя расейскаму грамадзтву. Такім чынам, расейская мадэль праваслаўнай культуры проціпастаўляецца заходняй мадэлі. Гэта добра ўпісваецца ў цяперашнюю ідэалёгію расейскай дзяржавы, якая «падымаецца з каленяў».

Але глыбокая супярэчнасьць палягае на тым, што моц вялікай ядравай дзяржавы, на спадчыне якой будуецца гэтая ідэалёгія, новы патрыятызм, стваралася савецкай інтэрнацыянальнай навукай — у тым ліку, акадэмікамі Сахаравым і Гінзбургам. Не Трафімам Лысенкам, з дапамогай якога была зьнішчаная школа генэтыкі, і ня Вольгай Лепяшынскай (зь яе практыкамі «саманараджэньня жыцьця» ў кепска прамытых прабірках), якія кляліся імем Сталіна і партыі, але Жэбракам, Зяльдовічам, Алфёравым і многімі-многімі іншымі навукоўцамі, незалежна ад іх унутраных перакананьняў.

Магчыма, пагрозу клерыкалізацыі грамадзкага жыцьця ў Расеі акадэмікі ў сваім лісьце й перабольшваюць. Хутчэй, з дапамогай тэлебачаньня адбываецца яго дэбілізацыя. Як і ў гады сталінскага «рэнэсансу», пышным цьветам зноў квітнее ілжэнавука. Так спэцыялісты-фізікі лічаць славутую праграму нанатэхналёгіяў нічым іншым, як сучаснай лысенкаўшчынай. Тым часам на фундамэнтальную акадэмічную навуку вылучаюцца мізэрныя сродкі зь бюджэту. Яна ж не прыносіць тае імгненнае аддачы, як інвэстыцыі ў пампаваньне нафты й газу з радовішчаў, якія вычарпаюцца. Трэба пасьпець набіць кішэні грашыма, пакуль «Трэці Рым» зноў ня ляснуў. Каб атрымаць падтрымку на навуковыя дасьледаваньні, трэба зарабіць, як і за ранейшым часам, схільнасьць начальства, спадабацца яму лісьлівымі выказваньнямі пра «асобую духоўнасьць» расейскага народу, які Крэмль і РПЦ разам вядуць у сьветлую будучыню.

Прэзыдэнт Пуцін аддае перавагу не Віталію Гінзбургу, а іншаму Нобэлеўскаму ляўрэату (па літаратуры) — Аляксандру Салжаніцыну, які з захапленьнем гаворыць пра адраджэньне праваслаўнай Расеі. Так што наўрад ці акадэмікі РАН дачакаюцца адказу на іх ліст зь вяршыняў іх дзяржаўнай улады.

Цікава, ці заўважаць яго ў Беларусі? І што гэтым разам напіша акадэмік Рубінаў?

з ь б я р ы «К н і г а р н ю «Н а ш а Н і в а»




**Паветраны шар**: беларускае мужчынскае апавяданьне

У кнігу ўвайшлі найлепшыя мужчынскія апавяданьні 1991 —2007 гадоў у выбарцы «Нашай Нівы». Гэта апавяданьні Вячаслава Адамчыка, Уладзімера Арлова, Ігара Бабкова, Васіля Быкава, Лявона Вольскага, Адама Глёбуса, і іншых — усяго 30 аўтараў.




**Жанчыны выходзяць з-пад кантролю:** Беларускае жаночае апавяданьне

У зборнік увайшлі творы найлепшых сучасных аўтарак: Тацьцяны Барысік, Евы Вежнавец, Марыі Роўды ды іншых.




**Бабілёнская бібліятэка:** Замежная літаратура ў перакладах «Нашай Нівы».

Эдгар Алан По, О. Генры, Яраслаў Гашак, Бруна Шульц, Альбэр Камю, Хорхэ Люіс Борхэс ды іншыя — на роднай мове

ш у к а й ц е ў к н і г а р н я х і ў н е з а л е ж н ы х р а с п а ў с ю д н і к а ў




**Найясьнейшая Рэч Паспалітая:** Цывілізацыя—Культура—Рэлігія—Палітыка—Авантура—Героіка—Успамін.




**Застаемся!** Сакавік 2006: Прыватнае і агульнае




**Печанко, С. У беларускім войску:** Падарунак прызыўніку.

Кніга — адмысловы падручнік для хлопца, што зьбіраецца ісьці ў войска, маючы ў сабе запал беларушчыны. Папярэджаны — значыцца ўзброены.

**З прадмовы Сяргея Балахонава**

с э р ы я з а с н а в а н а я ў г о н а р 100–г о д з ь д з я «Н а ш а й Н і в ы»

зьбяры «Кнігарню «Наша Ніва»




**Андрэй Дынько, Андрэй Скурко. Беларусь за 10 падарожжаў**

Кніга падарожных эсэ.




**Віталь Тарас. Звыклае зло**

Зборник эсэ.




**Алесь Кудрыцкі.** Суд на Каляды

Зборнік публіцыстыкі.

шукайце ў кнігарнях і ў незалежных распаўсюднікаў




**Андрэй Хадановіч.** Сто лі100ў на tut.by

Новая кніга паэта, якога няма патрэбы прэзэнтаваць.




**Наталка Бабіна. Крыві не павідна быць відна**

Кнігу склалі апавяданьні і дэтэктыўная аповесьць.




**Пётра Рудкоўскі. Паўстаньне Беларусі**

Пётра Рудкоўскі мне нагадвае Максіма Багдановіча — і першы, і другі адразу па прыходзе ў беларускае пісьменства (першы — у прыгожае, а другі — ужо ў інтэлектуальнае) радыкальна зьмянілі яго стыль і занялі ў ім вядучыя пазыцыі.

**З прадмовы Валера Булгакава**

сэрыя заснаваная ў гонар 100-годзьдзя «Нашай Нівы»

# Агент «Штазі» стаў трэнэрам зборнай Беларусі

30 ліпеня галоўным трэнэрам зборнай Беларусі па футболе быў прызначаны нямецкі спэцыяліст **Бэрнд Штанге**.

У адрозьненьне ад мінулых паседжаньняў Беларускай фэдэрацыі футболу, якія праходзілі за зачыненымі дзьвярыма, на сёньняшняе пусьцілі ўсіх ахвочых журналістаў. І хоць да апошняга часу ў прэс-службе фэдэрацыі адмаўляліся называць канкрэтнае прозьвішча наступніка Пунтуса, для ўсіх было ясна, што ім стане немец Бэрнд Штанге. Перад паседжаньнем ён прыляцеў у Менск зь Нямеччыны.

Прэзыдыюм выканкаму быў у поўным складзе, толькі трошкі спазьніўся гендырэктар менскага «Дынама» Юры Чыж.

У самым пачатку паседжаньня зь невялікім уступным словам выступіў кіраўнік Адміністрацыі прэзыдэнта, старшыня БФФ Генадзь Нявыглас. Ён адзначыў, што адразу пасьля адстаўкі Пунтуса фэдэрацыя разглядала сьпіс кандыдатур на пасаду галоўнага трэнэра зь дзевяці чалавек, пазьней ён скараціўся да пяці, яшчэ пазьней — да трох. Называць нейкія прозьвішчы Нявыглас ня стаў, толькі адзначыў, што там былі, як замежныя, так і беларускія спэцыялісты.

Паводле словаў Нявыгласа, Штанге быў абраны паводле наступных крытэраў: кваліфікацыя трэнэра; досьвед кіраўніцтва нацыянальнымі зборнымі; гатоўнасьць узначаліць інстытут зборных; ясная праграма; веданьне славянскага мэнталітэту і расейскай мовы.

Разам з тым, расказваючы пра новага «коўча», Нявыглас пераблытаў Ірак, дзе раней працаваў Штанге, з Іранам.

Пасьля слова ўзяў сам Штанге. Ён пачаў прамову на някепскай расейскай мове, паабяцаўшы праз два месяцы паслугоўвацца безь перакладніка, але потым усё ж перайшоў на нямецкую. Штанге адзначыў, што ўсе мы сёньня марым пра чэмпіянат сьвету. Менавіта гэта і ёсьць асноўнай мэтай і задачай для зборнай.

Бэрнд Штанге будзе стала жыць у Менску, паводле кантракту на радзіму ён зьедзе толькі падчас калядных вакацыяў. Ягоны кантракт разьлічаны на гэты год, а таксама на наступны адборачны цыкл. Сума кантракту не разгалошваецца.

Разам са Штанге ў Менск прыляцеў яшчэ адзін нямецкі трэнэр — Гаралд Іршмэр, які будзе асыстэнтам у зборнай.

Ужо праз тры тыдні наша зборная правядзе першы матч пад кіраўніцтвам новага трэнэра. Супернікам у таварыскай гульні будзе каманда Ізраілю, на наступным тыдні Штанге ўжо назаве склад на гэты матч.

Першая фраза, якую нямецкі трэнэр адрасуе да гульцоў зборнай, будзе: «Нельга падняць камень адным пальцам».

**Зьміцер Панкавец**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Крытэрам для выбару трэнэра было «веданьне славянскага мэнталітэту». Генадзь Нявыглас (зьлева), Бэрнд Штанге.**

### Гісторыя прызначэньня

Юры Пунтус падаў у адстаўку ў чэрвені пасьля дзьвюх паразаў нацыянальнай каманды ад баўгараў. Тады зборная страціла шанцы трапіць на Euro–2008. Нават вожыку было зразумела, што новым галоўным трэнэрам стане замежнік. Сярод прэтэндэнтаў называліся імёны чэмпіёна Эўропы–1972 немца Хорста Кёпеля і чэха Уласьціміла Петаржэлы, які трэніраваў піцерскі «Зэніт». Абодва былі зацікаўленыя ў прапановах БФФ, але абралі Штанге.

Бэрнд Штанге нарадзіўся ў 1948 г. на тэрыторыі Нямеччыны, акупаванай савецкімі войскамі (ад 1949 — ГДР).

Гульнявая кар'ера ня склалася — ужо ў 22 гады ён вымушаны павесіць буцы на цьвік праз цяжкую траўму. Ледзь не адразу пасьля гэтага Штанге заняўся трэнэрскай працай. Малады спэцыяліст узначаліць «Карл Цайс». З камандай ён двойчы выйграў першынства ГДР (1972, 1975). Пасьля ён пачаў працаваць з моладзевай і нацыянальнай зборнымі ГДР.

Пасьля развалу Бэрлінскага муру Бэрнд Штанге працаваў трэнэрам «Герты», але сышоў у адстаўку, бо сталі вядомыя ягоныя кантакты са «Штазі». Шмат гадоў Штанге пад псэўданімам «Курт Вэгнэр» зьяўляўся інфарматарам спэцслужбаў: ён «стукаў» на гульцоў, якіх трэніраваў.

У 1994 г. Штанге стаў першым замежным трэнэрам у абшарах былога СССР — ён узначаліў днепрапятроўскі «Дняпро», затым — кіеўскі ЦСКА. Яг гэдээравец, Штанге добра ведае расейскую мову.

Таксама Штанге працаваў у аўстралійскім «Пэрт Глоры», кіпрскім «Апалёне» і ў зборнай Аману.

У 2002 г. Удай Хусэйн, сын Садама, угаварыў Бэрнда ўзначаліць ірацкую зборную. Гэты крок Штанге рэзка крытыкаваўся ў нямецкай і эўрапейскай прэсе. Напярэдадні пачатку бамбардаваньня Іраку ў 2003 г. Штанге пакінуў краіну. Зборная ж Іраку сэнсацыйна заняла чацьвёртае месца на Алімпіядзе–2004 у Атэнах. 29 ліпеня іракцы, ужо бяз Штанге, упершыню ў гісторыі заваявалі Кубак Азіі.

# Вялікі дзякуй

**Паўлу Б., М.П., Алене К., Т.П., Т.П., Аляксандру П., Г.Я., Базылю К., Зьмітру М., Іраідзе З., Веры С.** зь Менску.

**Віктару М.** з Баранавічаў.

**В.Г.** зь Менскага раёну.

**Алене М.** зь Бярозы.

**Анатолю Б.** з Магілёва.

**В.Ж.** з Барысава.

**Уладзімеру В.** з Горадні.

**Аляксандру П.** з Глыбоцкага раёну.

Заклікаем **чытачоў**, якія атрымліваюць газэту, але **яшчэ не прыслалі дамовы**, зрабіць гэта як найскарэй. З пытаньнямі пра дамовы, аплату і дастаўку зьвяртайцеся па тэл.: (017) 284–73–29, (029) 260–78–32, (029) 618–54–84.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828

МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

КВІТАНЦЫЯ

Касір М.П.

## Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

**дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 8 тыс. рублёў.**

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) **Просім у блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

Па пытаньнях атрыманьня газэты пытайцеся Рамана.

# 15 сутак, ці Хата №22

Акрэсьцінскі дзёньнік **Алеся Каліты.**

Я пачаў весьці свой кароткі дзёньнік толькі на 8-я суткі, але жаданьне пачаць пісаць прыйшло раней, бо праз недахоп фізычнае актыўнасьці шматлікія думкі проста запатрабавалі пераносіць іх на паперу. Тут, на Акрэсьціна, звычайныя рэчы — бялюткая папера для друкаркі, асадка зь лягатыпам фірмы, дзе працуе твая дзяўчына, — набываюць асаблівую каштоўнасьць. Ну, ды няхай. Бадай, пачну.

## Суткі першыя

Затрыманьне нейкае бесталковае. Пры большай абачлівасьці мог бы ня сесьці. Калі нас з Пашам Серадзенкам прывезьлі ў Цэнтральны РУУС, мы яшчэ больш за дзьве гадзіны нічога ня ведалі пра свой далейшы лёс, хаця я і думаў пра арышт. Добра, што сябры прадугледзелі і прывезьлі вады і сёй-той ежы.Так што галоднымі з Пашам не засталіся, а дзякуючы Андрусю Ігнатовічу, які прыцягнуў спальнік, мы ня зьмерзьлі ў першую ноч. На Акрэсьціна нас прывезьлі ўвечары, недзе а 10-й. Як звычайна, пералічылі ўсе рэчы і закінулі ў сырую камэру на першым паверсе. Пасьля некалькіх просьбаў Пашу далі прыпаліць, і ён адну за адной выпаліў чатыры цыгарэты, жартуючы пры гэтым, што сьмяротная доза для чалавека — дзьве пачкі. Бліжэй да ночы аддалі спальнік. Трэба было спаць. Стомленыя дзённымі прыгодамі, мы захуталі ногі ў спальнік і заснулі. Сьніўся мне суд справядлівы.

## Сон

Сон быў вельмі падобны на судовы працэс над спадаром Лямкіным зь фільма «Хачу ў турму». Судзьдзя пачціва тлумачыла мне мае правы на роднай мове і хвалявалася за мой кашаль, які і сапраўды зьявіўся недзе пад раніцу.

Уначы было чутно, як на вуліцы грымеў салют.




МАЛЮНАК АЛЕСЯ КАЛІТЫ.

## Суткі другія

Пабудзілі нас недзе а шостай раніцы, мы прыбралі камэру, потым пасьнедалі аўсянкай і крыху сагрэліся гарбатаю бяз цукру. Недзе а 10-й раніцы нас з рэчамі выклікалі на калідор. Зь дзяжурнага пакою выйшаў адзін з канваіраў і, убачыўшы нас, гучна крыкнуў:

— Жыве Беларусь!?

— Жыве Вечна!!! — пачуў ён у адказ, усьміхнуўся, кіўнуў галавой і пачаў рабіць пераклічку ў адпаведнасьці са сваімі запісамі.

Пасьля гэтага першых восем чалавек, у тым ліку мяне і Пашу, павялі ў самую вялікую «Хату» аўтазаку — аддзел кузава памерам прыкладна мэтар на два, з вузкімі (20 см.) лавамі для сядзеньня.

Ад недахопу паветра выратоўвалі толькі адкрыты люк у кузаве ды дзьверы — краты. З Акрэсьціна нас павезьлі ў Цэнтральны РУУС , дзе, атрымаўшы тэлефоны, змаглі пасласць папрашайку *131*___# сябрам.

Нас адасобілі ад агульнага натоўпу адміністратыўнікаў і пасадзілі ў РУУСаўскі ізалятар, паведаміўшы, што на суд нас павязуць толькі пасьля другой гадзіны дня. Гэтая навіна, шчыра кажучы, крыху засмуціла, бо на судзе нас чакалі сябры, паплечнікі, адвакат, журналісты. Пасьля другой гадзіны нас вывелі з камэры і павезьлі ў «сабачым» аддзяленьні «РАФіка», за якім ехалі два спэцсуправаджальнікі на срэбнай «дзясятцы» .

Па дарозе мы з Пашам разглядалі, як рабочыя дэмантуюць сцэну каля Стэлы, а побач дворнікі зьбіраюць пляшкі ад 19-

градуснага «эліксіру весялосьці». Ля будынку суду Цэнтральнага раёну, дзе раней месьціўся ліквідаваны ўладай Беларускі гуманітарны ліцэй імя Коласа, нас чакалі сябры. РАФік стаў пад пякучае сонца, і «сабачнік» хутка нагадаў, што зроблены з жалеза і пафарбаваны ў цёмна-зялёны колер. Адчуваньне, што цябе, як шпроту, зажыва смажаць у слоіку, асаблівага аптымізму не дадавала. Потым тэмпэратура паднялася да 40, стала не хапаць паветра і мы пачалі прасіць пераехаць у цень. Але канваір (які сядзеў наперадзе з адчыненымі дзьвярыма) адмаўляўся: «Ну, я ж таксама сяджу ў машыне». Давялося маляваць у акенцы паплечнікам лічбы «03». Хуткая прыехала недзе праз дваццаць хвілінаў. І ў гэты момант мяне вывелі з «канваірскай лазьні». Ну, добра, гэта стане справай для асобнага «разьбіральніцтва» ў нашай зусім не незалежнай пракуратуры, куды я адразу пасьля выхаду падам адпаведныя скаргі.

## Судзілішча

Судзілішча прынцыпова не адрозьнівалася ад таго, якое, на жаль, ведае беларускае дэмакратычнае грамадзтва. Аднак, даведаўшыся, што Пашу далі дзесяць сутак, я пасьля некалькіх маіх «няўдалых спробаў» зразумець пытаньні ад судзьдзі: «Имя, фамилия , отчество, место рождения», — заявіў хадайніцтва пра ўдзел у працэсе перакладчыка. Быў абвешчаны перапынак, падчас якога я меў «душэўную» размову з адным з суправаджальнікаў — спачатку няшчасны паскардзіўся, што праз нас ужо трэці дзень ня можа патрапіць дадому, а потым пахваліўся, што ў ягоным падпарадкаваньні знаходзяцца сорак пяць участковых міліцыянтаў з Цэнтральнага раёну, з чым я яго і павіншаваў.

Перакладчык — задыханая жанчына — знайшоўся недзе праз хвілін сорак. Праўда, валодала яна добра толькі трасянкай, і нам з адвакатам ды Любай Лунёвай пэрыядычна даводзілася падказваць ёй пераклад тых ці іншых словаў.

Судовы вырак — 15 сутак. Да такога «пакараньня» я, у прынцыпе, і рыхтаваўся.

Калі вялі да РАФіка, пасьпеў папрасіць перадаць мне цёплую вопратку і Караткевіча. У спэцназаўца, што сьведчыў супраць мяне і Паўла, на мабілцы зайграла песьня: «Хоть нету ни кола и ни двора, чужие сапоги натерли ноги, работникам ножа и топора, романтикам с большой дороги». Напэўна, ён сам — вялікі рамантык.

На Акрэсьціна нас прывезьлі ўначы. Спальнік мне не аддалі, але гэта асабліва на сон не паўплывала. Надыходзіў трэці дзень.

## Суткі трэція

Уваходжу ў звычайны акрэсьцінскі рытм.

6:00 Пад'ём, прыборка камэры — дзяжурны міліцыянт выдае табе вядро, швабру, анучу, шуфлік ды расьцярушаны венік.

8:00 Сьняданак:

Каша — 90% аўсяная сечка.

Жалезны кубак (алюмініевыя прыбралі пасьля падарунка Анатоля Лябедзькі Дзіку Чэйні) несалодкай гарбаты.

Хлеб чорны — ¼ бохану і хлеб белы — 140 грамаў.

> Зь дзяжурнага пакою выйшаў канваір і, убачыўшы нас, гучна крыкнуў: Жыве Беларусь!?

9:00 Ранішняя праверка. Дзяжурны міліцыянт абыходзіць камэры і запытвае ў цябе пытаньні і пажаданьні. З большага фармальна, бо мае пытаньні наконт дзесяцігадзіннай разьбежкі паміж сьняданкам і абедам, а таксама наконт салодкай гарбаты так і засталіся без адказу.

18:00 Абед:

Суп — звычайна расольнік альбо боршч сваім выглядам і на смак падобныя да баланды.

Каша — звычайная аўсяная сечка альбо панцак.

Катлета — альбо хлебна-мясная, альбо рыбная.

Хлеб — ¼ бохану чорнага.

Хлеб белы — 140 г.

Вячэра:

Каша — звычайна грэцкая

Гарбата — несалодкая.

21:00 Вячэрні абыход дзяжурнага. Трэба расьпісацца за заўтрашняе харчаваньне.

22:00 Фармальны адбой. Але мы з суседзямі па камэры яшчэ доўга размаўляем «пра жыцьцё».

Недзе а 10-й раніцы нас з Пашам вывелі на калідор і разьвялі па розных камэрах на другім паверсе. Болей на тэрыторыі Акрэсьціна мы ня бачыліся.

Мяне перавялі ў 11 «хату».

## Хата №11

Камэра №11, здаецца, самая-самая вялікая камэра ў Акрэсьціна. Дзьве сцэны (драўляны насьціл, на якім сьпяць арыштаваныя) на шэсьць і дзесяць чалавек, даволі (1 м) шырокі праход паміж імі, што дазваляе хадзіць туды-сюды. Вечарам а 7-й нас было дзевяць, а бліжэй да 23-й да нас закінулі яшчэ траіх чалавек: Антона, які штосьці сьцягнуў на працы і атрымаў пяць сутак; Кірыла — п'яны зьбіў сьметніцу. Яшчэ аднаго — Андрэя — здала ўчастковаму маці. Ён зладзіў дома п'янку, папрыводзіў дзяўчат, за гэта і сеў на пяць сутак.

Сёньня мне прынесьлі першую перадачу — цёплыя рэчы і кнігу Ўладзімера Арлова — «Сланы Ганібала».



**Сябры сустракаюць Алеся Каліту на выхадзе з турмы.**

# 15 сутак, ці Хата №22


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

### Суткі чацьвёртыя

Удзень з адзінаццатай камэры мяне, Антона, Кірыла, Андрэя перакінулі ў 22-ю, што на 3-м паверсе. У ёй я і правёў усе адзінаццаць сутак. Там ужо быў адзін арыштаваны — Саша, мужчына гадоў пад сорак, затрыманы за банальную побытавую п’янку і асуджаны на 5 сутак.

«Хата №22» — разы ў чатыры меншая за №11 — прыкладна дванаццаць мэтраў квадратных. Прыкладна 80% камэры займае сцэна на 6 чалавек (хаця, паводле закону, на аднаго арыштаванага павінна быць ня меней за чатыры мэтры квадратныя), астатнія 20% — прыбіральня і вузенькі (30 см) праход паміж сцэнай і сьцяной. Недзе а 8-й вечара да нас закінулі васямнаццацігадовага хлопца Арцёма. Але на выгляд яму было ня больш за шаснаццаць год. Свае пяць сутак ён атрымаў за тое, што скраў у бацькі бэнзін, каб пакатацца зь сябрамі на матацыкле.

На ноч зьляпілі фішкі і кубікі, каб гуляць у так званую «мандавошку». Ноч прайшла хутка, праўда Андрэй некалькі разоў падыходзіў да кармушкі (квадратныя дзьверцы ў дзьвярах, прадугледжаныя для падачы ежы) і праз шчыліну спрабаваў кагосьці выглядзець. За дзьвярыма нікога не было.

### Суткі пятыя

Першая палова дня прайшла спакойна. Елі, спалі, чыталі, гулялі. Бліжэй да вечара пачалі размаўляць пра палітыку. Андрэй хадзіў па камэры, шукаючы ў сьценах жучкі і відэакамэры.

Лежачы на сцэне, мы спрабавалі адшукаць малюнкі на жоўтай тынкоўцы. Я разгледзеў мужчыну на асьле, а Антон убачыў жанчыну, што пасьлізнулася на бананавай лупіне.

Андрэй заявіў, што знайшоў у сьцяне адтуліну, дзе раней стаяў жучок, і што нават адчувае нейкія вібрацыі, бачыць інфрачырвонае выпраменьваньне.

Аб 11-й мы леглі спаць, але праз некаторы час нечакана прачнуліся ад дзікага ляманту і сутаргаў Андрэя — у яго здарыўся прыступ эпілепсіі. Мы сталі грукаць у дзьверы, каб паведаміць пра прыступ. Праз хвілін дзесяць сутаргі ў Андрэя скончыліся. Хуткая прыехала толькі праз паўгадзіны. Андрэю зрабілі ўкол і прапанавалі паехаць у лякарню, але той адмовіўся. Нас папярэдзілі, што яшчэ некаторы час хлопец будзе сам ня свой. І праўда, ён пачаў знаёміцца з намі, зьбіраўся некуды ісьці, але, зразумеўшы, што дзьверы зачыненыя, стаў дапытвацца: «А чаму ў гэтым пакоі шпалеры жоўтыя, а ня сінія?» Чаму ўрач казала яму, што гэта спэцпрыёмнік, ён жа, насамрэч, у гасьцях у сябра?

Сярод ночы Андрэй пачаў размаўляць услых зь нейкім «Владимиром Владимировичем» і, гледзячы праз краты, крычаць, што ад чырвонага сьвятла ў яго баляць вочы. Праз некаторы час ён з крыкам: «Ну ўсё, я аддам яго вам!» — кінуўся з кулакамі на Арцёма, які спаў. Дзякуй богу, мы хутка зрэагавалі і скруцілі Андрэя. Паклікалі калідорнага, але той пабаяўся вывесьці вар’ята.

Бліжэйшую гадзіну мы сачылі за Андрэем самі. Пэрыядычна ў адказ на нейкі загад з вочка камэры ад толькі яму бачных сілаў ён пранізьліва крычаў «Што?!» Ня спала ўсё Акрэсьціна. Недзе а 5-й раніцы за ім прыехала хуткая, а мы яшчэ доўга не маглі заснуць, асэнсоўваючы, што на нашых вачах літаральна за суткі ў чалавека зьехаў дах.

> Катлеты — так на Акрэсьціна называюць суткі, бо тут стабільна адзін раз на дзень выдаюць катлету.

### Суткі шостыя

Дзень прайшоў незаўважаным, бо трывожная ноч падарыла нам выдатны дзённы сон.

### Суткі сёмыя

Паціху вызваляюць суседзяў па камэры. Удзень атрымаў замоўленыя кодэксы — адміністратыўны і адміністратыўна-працэсуальны. А яшчэ — белую паперу, асадку, апошнія нумары «Нашай Нівы» і «Новага Часу». Пачаў наталяць смагу чытаньня.

### Суткі восьмыя

А 22-ой закінулі Сяргея, звонку акуратнага мужчыну, які падэбашырыў дома і атрымаў сем сутак. Палову дня спрабаваў дапрасіцца калідорную патэлефанаваць дадому. Безвынікова. Селі зь ім пісаць заяву на імя начальніка АСПР. Так, паводле працэсуальна-выканаўчага кодэксу, адміністратыўна арыштаванаму, па рашэньні начальніка спэцпрыёмніка, могуць быць дазволеныя тэлефонныя размовы з аплатай з асабістых сродкаў затрыманага.

Напісаўшы, перадалі заяву на імя начальніка. Пасьля гэтага, Сяргея некалькі разоў вадзілі да нейкага чалавека ў цывільным, які распытваў, аб чым гэта ён хоча паразмаўляць па тэлефоне і чаму напісаў такую афіцыйную заяву. Сяргею так і не дазволілі патэлефанаваць, але і пісьмовую рэзалюцыю начальніка яму так і не прадставілі.

### Суткі дзясятыя

З раніцы адбыўся шмон.

Шмон — гэта працэдура, якая праводзіцца звычайна два разы на тыдзень. Усіх выводзяць з камэры, пасьля чаго два супрацоўнікі мацаюць вопратку і

даглядаюць яе з дапамогаю мэталашукальніка. У гэты час яшчэ тры супрацоўнікі капаюцца ў вашых рэчах, што ляжаць у камэры, і зь ліхтарыкам праглядаюць усе шчыліны.

Падчас шмону адзін з супрацоўнікаў запытаўся, навошта мне столькі паперы. «Скаргі пісаць», — адказаў я. Зьдзіўлены, ён пазычыў мне посьпехаў.

Недзе пасля 12-й я стаў на батарэю і пачаў глядзець на мітусьню салдатаў Белпалка (так называецца вайсковая частка ўнутраных войскаў, што за Акрэсьцінам). Раптам унізе пабачыў чалавека ў сьветлай вятроўцы. Хтосьці знаёмы.

— Галіеў! — клікнуў я.

Чалавек спыніўся. Так, сапраўды гэта быў адвакат Аляксандар Галіеў. Ён абараняў мяне на судзілішчы. Аказалася, што адвакат прыходзіў да Пашы — сёньня яго павінныя вызваліць.

Аляксандар распавёў мне пра новыя справы, заведзеныя супраць Дашкевіча і Фінькевіча. І ён як раз сьпяшаўся да іх, таму падрабязнасьцей не паведаміў.

«Рэжым лютуе. Засталося стварыць лягеры і высылаць нязгодных туды пачкамі», — падумаў я.

Пасьля дзьвюх гадзін Сяргея перавялі ў другую камэру, а ў маю закінулі трох чалавек з 11-й камэры:

Іван — былы марак — атрымаў сем сутак. Здала жонка за п'янку.

Юра — па п'яні скраў тры жуйкі ў краме, за што атрымаў пяць сутак.

Андрэй — здаў участковаму бацька. Усё за тое ж — за п'янку.

Андрэй паўгоду таму датэрмінова вызваліўся зь «Віцьбы», дзе бачыў Казуліна і гуляў у футбол са Скрабцом. Ён распавёў, як аднойчы ў камэру да асуджаных, што пасьля адбою глядзелі тэлевізар, зайшлі дзяжурныя і пачалі гнеўна распытвацца, хто ім дазволіў гэтак парушаць рэжым. Пачуўшы ў адказ «Нам Казулін дазволіў!», разьвярнуліся і моўчкі выйшлі з камэры.

Ад Андрэя мы даведаліся пра жыцьцё Валадаркі: пра тое, што прыкладна раз на два месяцы ім ладзілі «маскі шоў» — у камэру забягалі бамбізы ў камуфляжы і масках і на арыштаваных адпрацоўвалі ўдары дубінкамі. А яшчэ — пра сыстэму коннай перапіскі, калі паміж карпусамі пускалі ніткі з распушчанага швэдра, па якім перацягваліся лісты. Такім чынам, паміж карпусамі і камэрамі вялася пастаянная перапіска. За яе адказвалі адмысловыя паштальёны — рассыльшчыкі. Іх працоўны час цягнуўся ад адбоя да пад'ёму. Днём жа яны спалі.

## Суткі адзінаццатыя

Пасьля сьняданка мяне пабудзіла вуркатаньне голуба, што прыляцеў на падваконьне нашай камэры. Я стаў на батарэю, шэрая птушка зь цікавасьцю пазірала на мяне. На пляцы Белпалка салдат на ЎРАле рабіў разварот. Праз пару хвілін да яго падышоў старэйшы па званьні міліцыянэр. Далей адбылася размова наступнага зьместу:

Старэйшы міліцыянт (СМ) — Ну скажи мне солдат, что ты, ё.. твою мать, творишь?

Салдат Унутранай Службы (СУС) — Машину разворачиваю.

СМ — Какова х..я? Она ж бл… ть стояла, никого на… й не трогала.

СУС — Так мне ж прапорщик приказал.

СМ — А с тобой кто бл..ть разговаривает? Капитан!

СМ — Поставь е.. твою мать машину на место!

СУС — Есть! …

## Суткі дванаццатыя

Цэлы дзень прыколваліся з адміністрацыі. Андрэй намаляваў нашу камэру і дзяжурную, што стаіць у дзьвярах.

Мне засталося дзьве катлеты. Катлеты — так на Акрэсьціна час ад часу называюць суткі, бо тут стабільна адзін раз на дзень выдаюць катлету.

## Суткі трынаццатыя.

Дзень пісаў лісты палітвязьням.

## Суткі чатырнаццатыя.

Раніцай Івана павезьлі на абсьледаваньне на алькагалізм. У кабінэце ўрача яму задалі чатыры анкетныя пытаньні, пасьля чаго ён разам са сьледчым паехаў назад у АСПР. Па дарозе сьледчы паказала яму акт толькі што праведзенага абсьледаваньня, зь якога вынікала, што Іван дзесяць год ужывае алькаголь запоямі і што ён «лживый и изворотливый». Той быў у роспачы. Мы вырашылі разам скласьці скаргу ў пракуратуру па факце паклёпу. Гэта крыху ўзьняло яму настрой.

Нарэшце маё дванаццацідзённае патрабаваньне адвесьці нас у душ дало свой плён, і мы гадзіну купаліся.

А 16-й да нас закінулі Фёдара — мужчыну год трыццаці пяці, бамжаватага выгляду. Фёдару далі дзесяць сутак за парушэньне арт. 17.1 (дробнае хуліганства). У суботу 14-га ён у падвале гастранома, што каля клюбу «Садко» (раён Камароўскага рынку) знайшоў двух забітых, пра што і паведаміў прыбіральшчыцы. На наступны дзень Фёдар даведаўся — яго шукае міліцыя. Тады ён сам патэлефанаваў у Савецкі РУУС, прыехалі міліцыянты, адвезьлі яго ў аддзяленьне. Пасьля трохгадзіннага допыту ў фармаце «Расказвай, хто забіваў?» склалі на яго пратакол і рапарты, быццам бы ён п'яны (на экспэртызу яго не вадзілі) лаяўся матам і правакаваў міліцыянтаў на бойку.

Распавёўшы нам гэтую гісторыю, Фёдар заявіў: «Нават калі буду бачыць, як каго-небудзь забіваюць, чорта з два ў міліцыю паведамлю!»

## Суткі пятнаццатыя

Лічу хвіліны да таго моманту, як апынуся на свабодзе.

А дзясятай мяне перавялі ў камэру на першым паверсе. Перавод наводзіў на тры думкі: альбо вывезуць і ўкатаюць яшчэ сутак пятнаццаць , альбо вывезуць у іншы раён гораду — там і адпусьцяць. Альбо проста выпусьцяць на пару гадзін раней. Так і выйшла. На вуліцы стаяла невыносная сьпякота. Сустрэць мяне прыйшло шмат сяброў. Дзякуй усім!





# Не хапае словаў

Дапаможнік «Навучаньне дэмакратыі ў паўсядзённасьці» кампрамэтуе беларускіх інтэлектуалаў. Піша **Даніла Жукоўскі**.

Няпроста вызначыць, колькі часу трывае ў Беларусі дыскусія пра тое, ці можна быць беларускім патрыётам (і шырэй — ці можна лічыць жыцьцё асобы ў Беларусі паўнавартасным), цалкам ізаляваўшыся ад беларускай культурнай глебы, не прызнаючы існаваньня нацыянальнага культурнага кантэксту. У час перабудовы да гэтага дадалася яшчэ тэма: ці магчыма быць дэмакратам у Беларусі й адначасна адмаўляць усё беларускае. У постсавецкі час спаборнічалі два праекты дэмакратычнай будучыні Беларусі: беларусацэнтрычнага, калі нацыянальнае разьвіцьцё зьяўляецца прыярытэтам, і небеларусацэнтрычнага, калі першачарговым дэкляруецца свабоднае самавызначэньне кожнай асобы.

Там, дзе тэорыя захоўвае вонкавую прыстойнасьць і ўласьцівую навуцы ўзважанасьць, паўсядзённая практыка прапануе іншы раз узоры выключнай ляпідарнасьці. Гэта, на погляд пэсыміста, дазваляе ўявіць, што прынясе перамога адпаведнай тэндэнцыі. Аптыміст жа бачыць тут толькі непрыгожыя інтэлектуальныя звычкі колаў, зь якіх рэкрутуюцца аўтарскія калектывы.

Вось жа калектыў — у складзе В.Бабровіча, В.Чарнова, З.Антановіч, В.Ахрук, М.Кузьняцова, Я.Чыкіна, У.Роўды, А.Вароненка, А.Шклярук, Д.Абразцова, І.Румянцава, О.Белавус — распрацаваў дапаможнік «Навучаньне дэмакратыі ў паўсядзённасьці» і выдаў яго пілотны варыянт пад рэдакцыяй В.Чарнова і В.Бабровіча ў горадзе Менску ў 2007 годзе. Дзьвюхсотстаронкавая праца ўражвае аднак ня столькі тым, што па-беларуску ў ёй усяго некалькі старонак, — гэта ў пэўным асяродзьдзі, на жаль, стандарт і спосаб дэманстрацыі амбіцыяў. Уражвае, што Беларусь праігнараваная **цалкам**, з усімі рэаліямі, гісторыяй, літаратурай, фальклёрам і асаблівасьцямі побыту.

Літаратура ў бібліяграфіі ў прыгнятаючай большасьці расейская, шматлікія цытаты з расейскіх клясыкаў істотна пераважаюць над думкамі мудрацоў іншых народаў, беларускія дзеячы і творцы не прадстаўленыя ўвогуле, а тыя нешматлікія месцы, дзе словы «Беларусь» і «беларускі» ўжываюцца, ня ўтрымліваць анічога спэцыфічна беларускага. Зьяўляецца думка, што словы гэтыя, калі надарыцца шанец, плянавалася заступіць на «Расея» і «расейскі» ды прасунуцца на непараўнальна больш ёмісты і грашавіты расейскі рынак. Уласна кажучы, хай сабе — але навошта гэта ўсё ў Беларусі?

Недаўменьне гранічна абвастраецца падчас чытаньня сцэнару кляснае гадзіны-дыспуту «Што значыць быць патрыётам сёньня?» для 10—11 клясаў (ст. 132—135):

*Тема патриотизма — ныне жгучая и больная тема для нашей страны, для русских людей...*

*Армия во все времена находилась в центре внимания российского общества...*

*Вывод: молодёжь ратует за возрождение Беларуси как сильной державы, а также за экономическую и финансовую стабилизацию в Беларуси. Таким образом, в своих стремлениях, ценностях и жизненных планах молодёжь очень близка к старшему поколению, и в этом смысле можно говорить о возрождении преемственности...*

Нават афіцыйная прапаганда стаіць бліжэй да здаровага сэнсу: закранаючы тэму патрыятызму, старанна выкрэсьлівае непажаданыя беларускія сюжэты, але не спрабуе рабіць выгляд, быццам няма ані беларусаў, ані Беларусі.

Справядліва будзе зазначыць (і тут на дапамогу прыходзіць недаацэненая аўтарскім калектывам скарбніца беларускай рыторыкі), што ня ўсё толькі дрэннае спалучана са згаданым дапаможнікам. Ёсьць там нямала старонак, якія сапраўды, як той казаў, адлюстроўваюць пэўнага (хутчэй за ўсё, англа-саксонскага) кшталту разуменьне дэмакратыі. Іншая рэч, што нязначныя па памеры, але важкія выразна чужародныя для Беларусі фрагмэнты вызначаюць скіраванасьць настолькі жорстка, што агульна правільныя, але безаблічныя тэксты ў якой заўгодна колькасьці сытуацыю не выпраўляюць.

Што гэта: неахайная кампіляцыя, каб адбіць грошы, ці маніфэстацыя пераемнасьці паміж дашчэнту зрусіфікаванаю сьвядомасьцю савецкага інтэлігента зь беларускай прапіскаю і розумам захопленага нэаімпэрскімі фантазіямі прадстаўніка расейскамоўных дэмакратаў, якому лёс наканаваў «нарадзіцца, жыць і тварыць» у адміністрацыйнай ізаляцыі ад «белакаменнай»? Калі правільны першы адказ, дапаможнік кампрамэтуе беларускіх інтэлектуалаў з гледзішча працоўнае этыкі. Калі другі — сорамна за ўзровень культуры, які дазваляе, прысьвяціўшы шмат старонак разьвіцьцю ў маладых беларусаў талерантнасьці, павагі да суседа, рацыянальнаму й адказнаму фармаваньню перакананьняў, адначасна ігнараваць усё, што робіць яго беларусам ды яшчэ й прапаноўваць выхаванцам сумнеўную ролю: «*А для возрождения Беларуси необходимо только трудиться. Много и благостно*».

Каб яшчэ хто патлумачыў, чаму менавіта — «благостно»?

Нялёгка ўстрымацца ад спакусы разгорнутага абмеркаваньня «дапаможніка», але падаецца нявартым марнаваць

публіцыстычны запал на падыходы, даўно і неаднойчы ацэненыя па заслугах. Іншая рэч — пытаньне: якое месца стваральнікі гэткіх выданьняў займаюць у беларускім грамадзтве, якія ўласьцівыя нашаму грамадзтву каштоўнасьці ўвасабляюць вынікі іхняе дзейнасьці.

Ключавым момантам мне падаецца, па-расейску кажучы, «бесстрастность» у выкананьні. Матэрыял пададзены холадна й адстаронена. У якасьці цытатаў і прыкладаў бярэцца тое, што бліжэй ляжыць — «падножны корм», выпрабаваны арсэнал савецкае пэдагогікі ды першыя-лепшыя цытаты з заходніх «дапаможнікаў для тубыльцаў». Аніводная з канцэпцыяў, якім аўтары імкнуцца навучаць, не выглядае асэнсаванаю імі праз уласны досьвед.

Перад намі яскравы доказ уласьцівай нашаму грамадзтву няўвагі да ўсяго, што вышэй за чарку і скварку, пагарды да хаця трошкі абстрактнага і складанага. Сьведчаньне таго, што жорсткі жыццёвы прагматызм жыхароў Беларусі апошнія дзесяцігодзьдзі настойліва эвалюцыянуе ў бок прымітывізму. Выпрацаваліся спэцыфічныя мэтады разумовай дзейнасьці паводле чужой замовы, калі стымулам зьяўляюцца выключна грошы, а формаю працы — пагадзінная здача ўласных мазгоў у арэнду з дазволам спонсарам круціць у гэтым працэсары якую заўгодна праграму пры поўнай эмацыйнай незаангажаванасьці асобы.

А можа, гэта якраз і значыць: «трудиться благостно»? То бок не абцяжарваючы душы, захоўваючы спакой ва ўтульным логвішчы свайго эга? З гледзішча працоўнае мабільнасьці, зручна — лёгка пераходзіць ад аднаго праекту да іншага. Існуе толькі адна небясьпека: калі раптам захочацца нешта сказаць сваё, можа выявіцца, што здольнасьць гэткая страчана назаўсёды. Проста ня будзе ўласных словаў.

*Горадня*



# Акцыі круцяць, людзей абкручваюць

На Захадзе акцыі купляюць не дзеля дывідэндаў, а дзеля магчымасьці ў любы час з выгадай перапрадаць. Піша **Руслан Равяка**.

Корпаўся колькі дзён таму ў шафе й неспадзявана выцягнуў картку з чырвонаю «Пагоняю». Чэкі «Маёмасьць», празваныя ў народзе на расейскі капыл «ваўчары». Калі цяперака запытацца ў народу пра тую прыватызацыю, дык пачуеш нараканьні, што падманулі народ…

Першы раз дзяржава нешта аддала простаму чалавеку за так. Але просты чалавек, не навучаны карыстацца капіталістычнымі прыладамі, прадаў тыя чэкі ці ў найлепшым выпадку ўклаў у інвэстыцыйны фонд. Ня будзем чапаць сумны лёс фондаў. Прыгледземся да спадзяваньняў простага чалавека. Амаль кожны адпачатку чакаў шалёных грошай-дывідэндаў.

Неяк пачуў тэлефанаваньне на радыё Свабода. Стары скардзіўся, што ўклаў свае чэкі ў акцыі нейкага прадпрыемства. Тое праз пяць год налічыла дывідэнды — ня хопіць і на аўтобусны талён. Вось якія махляры, ліха іх матары…

Як высьветлілася, за мяжою ведаюць адзін сакрэт! Ніхто не купляе акцый дзеля дывідэндаў! Акцыі купляюцца дзеля акцый. Якія можна заўжды прадаць. Чалавек плянуе, што кошт іх праз пэўную колькасьць год уздымецца і можна будзе выгадна іх прадаць, напрыклад, дзеля аплаты адукацыі дзяцей.

Кошт акцый складаецца з кошту прадпрыемства. А прадпрыемства вартае нагэтульні, наколькі вартае яе абсталяваньне, машыны і прылады. Агульны кошт прадпрыемства дзеліцца на колькасьць акцый, і мы даведаемся рэальную цану адной акцыі. Калі зношанасьць нашых заводаў большая за 70%, пра што гаварыць…

Штогод на сходы зьбіраюцца акцыянэры прадпрыемства і вырашаюць, што рабіць з прыбыткам (калі ён наагул ёсьць). Можна цалкам аддаць на выплату дывідэндаў. Пра гэта марыць большасьць шараговых уласьнікаў акцый у нашай краіне. Але магчыма таксама й выдаткаваць тыя сродкі на вытворчыя патрэбы — набыцьцё новага абсталяваньня. Тады грошай гатоўкаю просты акцыянэр не атрымае зусім, затое ўзрасьце вартасьць ягоных акцый, бо ўзрасьце кошт самога прадпрыемства, а новыя тэхналёгіі дазволяць зарабіць яшчэ больш прыбытак.

Вартасьць акцыі — гэта добра, але ня ў нашай краіне. Дзяржава тут апякуецца ўсімі намі, каб ніхто бронь Божа не падмануў. Таму ў нас нямашака паўнавартаснага рынку каштоўных папераў. Тыя акцыі вельмі цяжка некаму прадаць. Дый прадпрыемствы, што маюць добры прыбытак і пэрспэктывы, чамусьці сваіх акцыяў любому не прадаюць.

А на большасьці астатніх заводаў дзяржава трымае 70—99% акцый, і астатнім трымальнікам на тыя сходы няма чаго хадзіць, бо ўсё ўжо вырашана наверсе.

*Баранавічы*

# 7 жніўня Адаму Мальдзісу спаўняецца 75 гадоў



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Эўропа пра мірны атам

Беларускімі дзяржаўнымі СМІ ідэя будаўніцтва атамнай электрастанцыі падаецца як ужо ўхваленая ўсенароднa. Рапартуецца: ідзе праца па стварэньні органа, які будзе адказваць за бясьпеку атамнай электрастанцыі — як таго патрабуе МАГАТЭ, падбіраецца пляцоўка для будоўлі…

Тым ня менш, стаўленьне беларусаў да мірнага атама, хутчэй, скептычнае. Гэта пацьвярджае апытаньне, праведзенае ў рамках міжнароднага дасьледніцкага праекту «Эўразійскі манітор» беларускай Лябараторыяй аксіямэтрычных дасьледаваньняў «Новак». Вынікі такія, што толькі 32% рэспандэнтаў выказалі сваю падтрымку выкарыстаньню ядзернай энэргіі як аднаму са спосабаў забесьпячэньня Беларусі электраэнэргіяй, у той час як 53% апытаных адказалі «не ўхваляю». Хаця грамадзкая думка па гэтым пытаньні яшчэ не канчаткова сфармаваная, паколькі грамадзтву па-просту не прапаноўвалі ўсур'ёз задумацца, ці сапраўды нам патрэбная АЭС?

### ЭЗ: стаўленьне да атама

Мірны атам і ў Эўропе ня мае адназначнай ацэнкі. У кожнай эўрапейскай краіне стаўленьне да выкарыстаньня ядзернай энэргіі эвалюцыянуе па-свойму.

Напрыклад, Бэльгія і Нямеччына ад самага пачатку гатовыя былі інвэставаць у атамную галіну, але затым інвэстыцыі пачалі скарачацца і нарэшце спыніліся — гэтаму спрыяла катастрофа на Чарнобыльскай АЭС. У 1986 і наступных гадах многія эўрапейскія дзяржавы пайшлі на тое, каб цалкам адмовіцца ад атамнай энэргетыкі.

Пры гэтым Францыя здолела пераканаць грамадзян, што ядзерная энэргетыка бясьпечная, і працягвае разьвіваць гэтую галіну.

Эўрапейская Камісія, якая прадстаўляе ўсе 27 дзяржаваў-чальцоў Эўрапейскага Зьвязу, знаходзіцца ў даволі складанай сытуацыі. Яна, з аднаго боку, павінна пачуць галасы тых, хто жадае адмовіцца ад выкарыстаньня ядзернай энэргіі, з другога боку — галасы тых, хто лічыць, што ядзерная энэргія неабходная для далейшага разьвіцьця.

Адзін з аспэктаў, які выклікае занепакоенасьць эўрапейцаў — доўгатэрміновае захоўваньне ядзерных адкідаў. Вельмі цяжка патлумачыць грамадзкасьці, як ядзерныя адкіды могуць захоўвацца сотні і тысячы гадоў.

З другога боку, да занепакоенасьці экалёгіяй дадаецца праблематыка парніковага эфэкту, а эўрапейцы шукаюць шляхі вытворчасьці энэргіі бяз выкідаў парніковых газаў. Таму грамадзкая думка і парлямэнты ў некаторых краінах Эўразьвязу ўжо лічаць, што ядзерная энэргія магла бы быць адказам на выклік парніковага эфэкту.

У дакумэнтах, якія Эўрапейская Камісія адрасавала сваім партнэрам па праектах у галіне атамнай энэргетыкі на працягу апошніх пяці гадоў, у асноўным казалася пра аспэкты надзейнасьці АЭС. Але нядаўна ў сьпіс прыярытэтаў Эўракамісіі вярнулася вытворчасьць ядзернай энэргіі.

Даведка: Атам на мяжы

Галоўная ідэя Эўразьвязу адносна атаму застаецца нязьменнай: ён павінен быць бясьпечным. У 90-я гады Эўразьвяз ініцыяваў праграмы, накіраваныя на аказаньне дапамогі краінам Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы і новым незалежным дзяржавам (ННД, не кандыдатам у ЭЗ) у гарантаваньні бясьпекі іх рэактараў – Фарэ і Тасіс. Аднак, нягледзячы на тое, што праграмы ў галіне ядзернай бясьпекі адыгрываюць важную ролю ў Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропе, шэраг праблемаў усё адно застаецца. Ізьвязаныя яны найперш зь фінансавымі цяжкасьцямі. З 66 рэактараў савецкага тыпу 21 знаходзіцца ў Цэнтральнай Эўропе, 45 у новых незалежных дзяржавах. З гэтай колькасьці 35 рэактараў (13 у Цэнтральнай Эўропе і 22 у ННД) патрабуюць сур'ёзнай мадэрнізацыі. І іх бясьпека вымагае вялізных капіталаўкладаньняў.

Дадзеная публікацыя падрыхтаваная пры спрыяньні Эўразьвязу і не абавязкова адлюстроўвае афіцыйны пункт гледжаньня ЭЗ.
По дадатковую інфармацыю зьвяртайцеся на сайт www.delblr.ec.europa.eu

## Барысаўскі маньяк атрымаў 25 гадоў

Калегія па крымінальных справах Менскага абласнога суду прызнала 24-гадовага жыхара Барысава вінаватым у замаху на забойства дзьвюх дзяўчат, а таксама ў зьбіваньні і згвалтаваньні 11-гадовай дзяўчынкі. Абвінавачаны прыгавораны да 24 гадоў і 10 месяцаў турмы. На думку псыхіятараў, прычынай вычварэньняў у псыхіцы гэтага чалавека маглі быць крыўды на сястру, перанесеныя ў маленстве.

## Смолава — расчараваньне «Новай хвалі»

У Юрмале (Латвія) завяршыўся поп-фэстываль «Новая хваля». Пераможцай стала Натальля Гардзіенка (Малдова). Другое і трэцяе месца падзялілі ўкраінскі дуэт з опэрнымі галасамі «Барсэлёна» і латыш Эргліс. На думку латыскай прэсы, беларуска Паліна Смолава стала расчараваньнем фэсту. Беларуска падзяліла пятае-шостае месцы з казаскай групай Rin'Go. Прэса асабліва пацяшалася, калі на просьбу вядоўцы назваць тры адметнасьці Беларусі, сьпявачка ўспомніла толькі адну: прэзыдэнта.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## У Шклове помнік агурку

28 ліпеня ў горадзе прайшло сьвята Агурка — другі год запар. У часе сьвята каля Дому культуры адкрылі помнік Агурку — гэта мужычок з кошыкам агуркоў. Вырабіў яго магілёўскі скульптар Андрэй Вераб'ёў і назваў Агуродцам. У наступным годзе зьявіцца і гімн Агурку.



GAZETABY.COM

## Кіроўца выжыў пад вадой

Пашанцавала аднаму вадзіцелю, які ехаў па шашы Гомель—Калінкавічы. У ягоным аўтамабілі лопнула шына. Машына вылецела ў кювет і перакулілася. Горш — яна апынулася уверх коламі ў сажалцы глыбінёй паўтара мэтра. На шчасьце, у гэты час па дарозе ехалі пажарнікі, і яны, не марудзячы, кінуліся на дапамогу. Адчыніць дзьверцы пад вадой яны ня здолелі. І тады яны проста перавярнулі яго на колы, стоячы ў вадзе.

## Шасьцігадовага хлопчыка забіла токам каля кіёску

У Гомелі загінуў хлопчык, дакрануўшыся да халадзільнай устаноўкі, якая разьмешчаная на вуліцы побач з кіёскам. Чаго яго ўдарыла токам, разьбіраюцца.

## Страляніна на расейскай мяжы

Ля вёскі Ходараўка (Горацкі раён) міліцыя спрабавала спыніць для праверкі КамАЗ. Аднак вадзіцель толькі паддаў хуткасьць. За ім кінуліся ў пагоню, сталі страляць па колах. Трапілі, але грузавік працягваў рухацца на дысках. І такі пераехаў мяжу. Знайшлі яго на расейскім баку ў Красьненскім раёне. Вадзіцель зьбег. А ў КамАЗе знайшлі кантрабанду — 15 тон мэталалому.

## 11-ы «Кубак Свабоды» па футболе

28 ліпеня ў парку Чалюскінцаў у Менску прайшоў 11-ы «Кубак Свабоды» памяці палітыка Генадзя Карпенкі. Турнір традыцыйна прымеркаваны да дня прыняцьця Дэклярацыі аб дзяржаўным сувэрэнітэце. Удзел узялі шэсьць камандаў — зборныя Аб'яднанай грамадзянскай партыі, Партыі камуністаў, Партыі БНФ, Грамады, журналістаў, а таксама дэмакратычных сілаў Дзяржынскага раёну. Мінулыя чатыры гады перамагала зборная журналістаў. Сёлета наймацнейшаю стала каманда БНФ.

## Чарговы пракол АНТ

У вечаровай праграме «Наши новости» ў суботу 28 ліпеня быў паказаны рэпартаж пра сплаў па рацэ Нёман лодкі, якую пабудавалі рабочыя гуты «Нёман» зь Бярозаўкі. У ім расейскага падарожніка Юр'я Сянкевіча журналісты зблыталі з польскім пісьменьнікам Генрыкам Сянкевічам. Дый яшчэ напісалі: Сінькевіч. Памылка на сайце стаяла ўвесь наступны дзень. Перад тым АНТ памылкова зблытаў вынік гульні БАТЭ ў Эўракубку.

## 95-гадовая бабуля стала папулярным блогерам

Марыя Лопэс з Муксіі, гарадка на паўночным захадзе Гішпаніі, стала самым папулярным у сваёй краіне блогерам. Блог — гэта адкрыты для ўсіх дзёньнік, які чалавек вядзе ў інтэрнэце. «Сябры па сеціве! Сёньня мне споўнілася 95 гадоў. У мяне дзень народзінаў, і мой унук-скнара падарыў мне блог». Гэтымі словамі ў сьнежні 2006 г. пачалася гісторыя неймавернага посьпеху.

Тэмы, што падымае сэньёра Лопэс, розныя. Уражаньні маладосьці, успаміны пра грамадзянскую вайну, сёньняшняя Гішпанія, палітыка.

## Рэканструкцыя аўтавакзалу

У сувязі з рэканструкцыяй Цэнтральнага аўтавакзалу з 1 жніўня зьмяніліся пункты адпраўленьня прыгарадных аўтобусаў са сталіцы. Зьмены пазначаныя на інфармацыйных шыльдах аўтавакзалу, паведамляе пра іх і даведка 104.

**АГ, ЗП;
Радыё «Рацыя»,
«Звязда»,
newsru.com**

# Нэасталінскае кіно

«Лінія Сталіна», фальшаваньне Курапатаў. Такая палітыка. Зьявілася й нэасталінскае кіно. «Бацькі народаў» у ім няма, затое ёсьць НКВД і «савецкая дзяржаўнасьць». Карціна **«Вам заданьне»** 2004 году паводле аднайменнага твору сэнатара Чаргінца зьяўляецца ўзорным нэасталінскім фільмам. Добры чэкіст змагаецца з панамі перад вайной і з панамі-бандытамі пасьля вайны. Фільм Бяржыцкага бяздарны да геніяльнасьці і настолькі кепскі, што ўзначальвае ганаровы сьпісы трэш-афіцыёзу.

Але, нягледзячы на мастацкі й глядацкі правал «чаргінцоўскае» стужкі, за ёй пайшлі настойлівыя працягі. Карціна **«Глыбокая плынь»** (2005) Маргарыты Касымавай, пастаўленая па аддаленых матывах шамякінскіх твораў, распавядае пра партызанку ў акупаванае Беларусі. Румяныя партызаны ахоўваюць падпольны аэрадром. Характараў няма, а самай ачалавечанай у фільме выглядае вайсковая статыстыка.

Дэбютны фільм Пятра Крывастаненкі **«Яшчэ пра вайну»** 2004 году — пазначаны як пасьляваенная мэлядрама. Але галоўнае ў фільме — не чалавечыя пачуцьці (адсутныя), а чысьценькія вайсковыя шынялі і настальгія па сталінскім 50-ым — засьнятым на сучасны «Кодак».

2 ліпеня ў сталічным кінатэатры «Масква» адбылася сарамлівая прэм’ера чарговай рэтрасталінскай стужкі.

Расейска-беларускі фільм Алы Крыніцынай **«Радзіма альбо сьмерць»** паразытуе на тыповых тэмах «Беларусьфільму»: вайна й дзеці. Немцы стварылі лягер для дзетак-дывэрсантаў. Сіротаў закідваюць у савецкі тыл, каб падрываць цягнікі (!). Але на варожую тэрыторыю закідваецца атрад зухаватай чэкісткі. Перавэрбаваныя дзеткі далучацца да НКВДоўцаў…

Акторы граюць як гістэрычныя малпы, чэкістка-гераіня ходзіць па акупаванай тэрыторыі з наганам і ў форме (!), вясковы інтэлігент пнецца з кніжкамі ў лес, каб даць пачытаць партызанам «Радзіму альбо сьмерць». Гэта не пародыя — усё абсалютна сур’ёзна.

Галоўная чэкістка (блізкая сваячка садысткі з трэшу «Ільза – ваўчыца СС») расстрэльвае бязьвіннага чалавека, каб завэрбаваць ягонага брата, і заходзіцца крыкам, калі чуе пра сталінскія рэпрэсіі. (Наган і куля ў чужой галаве — гэта добра.)

На гэтую залімітную лухту абавязкова павядуць беларускіх школьнікаў, каб яны вучыліся сталінскаму гуманізму.

Беларусь была толькі палігонам — рэстаўрацыя сталіншчыны цяпер распачалася ў Расеі. Расейскае «патрыятычнае» кіно не настолькі бяздарнае, як нэасталінскае беларускае: болей грошай, лепшыя акторы, больш вытанчаны сцэнар — і атрута сталінізму танчэйшая.

Па канале НТВ запускаюць сэрыял пра асабістае жыцьцё Сталіна, дзе зь цеплынёй гаворыцца пра «бацьку народаў»

У расейскай карціне Аляксея Піманава **«Тры дні ў Адэсе»** (2007) патаемны НКВДыст адпраўляецца ў пасьляваенную Адэсу, каб зьнішчыць небясьпечную банду. У карціне будуць амуры, бязладная страляніна й сто-


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

млены тэлевізійны шоўмэн Леанід Якубовіч. Але галоўнае — бесканфліктна-глямурная карцінка з саладжава-сталёвай інтэнцыяй: «Зьнішчыць усіх, без суду й сьледзва». І татуіроўка-кляймо — «Сьмерць Гітлеру ад Сталіна» — каб запомнілі, хто найгалоўнейшы.

Нягледзячы на «карцінку», стужка Піманава — гэта **кепскі фільм**. І гэта першая прыкмета нэасталінскага кіно. Вылізаная карцінка, «прыгожанькая» бесканфліктнасьць, няма «дакумэнту», шурпатасьці эпохі — усе румяныя, сытыя і здаровыя. Гэта трэшафіцыёз, трэш-глямур.

**Гэбэфілія** — ключавая прыкмета неасталінскага кіно. НКВДоўцы — выключна станоўчыя пэрсанажы.

Трэцяя рыса рэтрасталінскага кіно ні ў якім разе не была бы ўхваленая «генэралісімусам». Магчыма, ён бы загадаў расстраляць рэжысэраў за падобныя вольнасьці. Але што зробіш — трэба ўлічваць сучасныя павевы, прыцягваць маладую аўдыторыю. **Шынельная эротыка** — яшчэ адна прыкмета рэтрасталінізму.

Па-за канкурэнцыяй тут беларуская стужка «Яшчэ пра вайну». Мэдсясьцёркі доўга парацца ў лазьні і бегаюць аголеныя па сьнезе. Юрлівыя вочы афіцэраў… А сцэне, калі гераіня ў шынелі эратычна хрыпіць і лашчыцца да свайго мужа — пазайздросьцілі б усе трэшмэйкеры.

Надзвычай паказальная расейская карціна **«Май»** (ішла ў менскіх кінатэатрах). Стужка Марата Рафікава і Ільлі Рубінштэйна пазначаецца як «патрыятычная казка» і датаваная 2007 годам. Герой гэтае казкі — баец Чачэнскай вайны, які едзе ў Маскву за навабранцамі. Ён выконвае заданьне, п'е з аднапалчанамі (цяпер патрыятычнымі сутэнэрамі) і сустракае сваё каханьне — пяшчотную прастытутку. Клясычная стужка «Баляда пра жаўнера», якая была знакам адлігі, тут перакручаная на эратычны капыл.

Беднае, беднае кіно!...

**Андрэй Расінскі**

# Чаму вакол столькі зла?

Дзіўныя бываюць супадзеньні: 30 ліпеня, у адзін дзень, з жыцьця пайшлі два найвялікшыя рэжысэры сучаснасьці. 94-гадовы італьянец **Мікелянджэла Антаніёні** і 89-гадовы швэд **Інгмар Бэргман**.

Зь іхнімі імёнамі зьвязаная Вялікая эпоха аўтарскага кінэматографу. Яе росквіт прыпаў на1960-я гады.



## Майстар формы

Мікелянджэла Антаніёні нарадзіўся 29 верасьня 1912 году ў горадзе Фэрара, які мае вялікія культурныя традыцыі. Скончыў вышэйшую школу эканомікі й гандлю ў Балёньі. Навучаўся ў Рымскім экспэрымэнтальным кінацэнтры. Распачынаў як кінакрытык: друкаваўся як у фашыстоўскім часопісе «Чынэма», так і ў падпольнай «Італья Лібэра». Быў асыстэнтам Марсэля Карнэ на здымках «Вячэрніх наведвальнікаў», напісаў аналітычны артыкул «Марсэль Карнэ — парыжанін». Быў суаўтарам сцэнароў фільмаў «Пілёт вяртаецца» Рабэрта Расэліні, «Трагічнае паляваньне» Дэ Сантыса, «Белы шэйх» Фэліні. Дэбютаваў кароткамэтражнай дакумэнтальнаю стужкай **«Людзі з ракі По»** (1943—1947).

Апошняя ж карціна Антаніёні — кароткамэтражная навэля ў зборніку **«Эрас»** (2004). У 1995 годзе, ужо спаралізаваны, ён зьняў зь Вімам Вэндэрсам фільм «За аблокамі».

Па словах Антаніёні, ён вырашыў стаць рэжысэрам у вар'ятні, дзе ўпершыню зазірнуў у аб'ектыў, каб здымаць аматарскі фільм пра хворых.

Майстар вытанчанай кінэматаграфічнай формы — савецкія крытыкі лаялі яго за «мадэрнізм» — быў таксама вынаходнікам неарэалізму (**«Людзі з ракі По»**).

Фільм **«Прыгода»** (1960) выклікаў скандал на Канскім фэсьце. Каб паказаць чалавечае адчужэньне, рэжысэр наўмысна парушыў сюжэтную лёгіку.

**«Ноч»** (1961), **«Зацьменьне»** (1962) і **«Чырвоная пустыня»** (1964) — знакамітыя драмы «разьяднанасьці», якія перагукаюцца з **«Маўчаньнем»** і **«Пэрсонаю»** Бэргмана.

Самыя неверагодныя экспэрымэнты з колерамі рабіў Антаніёні ў «Чырвонай пустыні». Адна з найскладанейшых працаў з гукам — **«Прафэсія: рэпартэр»** (1975). Антаніёні працаваў і з «Пінк Флойд» (**«Забрыскі Пойнт»**, 1970).

Самая папулярная карціна Антаніёні — **«Фотапавелічэньне»** (1966) паводле апавяданьня Хуліа Картасара «Сьлюні д'ябла».

Фільмы Антаніёні — запаволеныя краявіды душы, якая пакутуе ад самоты і пустаты.

Сёньня так не здымае ніхто.



## Знаўца чалавека

Інгмар Бэргман нарадзіўся 14 ліпеня 1918 году ва ўнівэрсытэцкай Упсале, у сям'і пастара. У 1944 годзе завершыў факультэт літаратуры і мастацтва Стакгольмскага ўнівэрсытэту. Працаваў рэжысэрам у правінцыйных тэатрах.

З канца 60-х гадоў ставіць спэктаклі на сцэне Каралеўскага тэатру, быў ягоным дырэктарам. Працу ў кіно распачаў сцэнарыстам. У 1946 годзе — рэжысэрскі дэбют (**«Крызіс»**).

Апошнія гады пражыў самотнікам на высьпе Фаро.

Сказаць, што сышоў Вялікі рэжысэр, які зьмяніў сусьветны кінэматограф, значыць не сказаць анічога.

У фільмах гэтага швэда людзі з розных куткоў сьвету пазнавалі сябе й адкрывалі схаваныя таямніцы сваёй душы.

Адкуль такое веданьне чалавека?

Сын пастара Інгмар запытваўся, як старазапаветны Іёў: «Чаму вакол столькі зла? Дзе Божая міласэрнасьць? Дзе – адказ Госпада?» І гэтую размову ён вёў сродкамі кінамовы.

Рыцар спавядаецца Сьмерці ў сваім бязьвер'і (**«Сёмая пячатка»,** 1957), стары адчувае цяжар уласных грахоў і сьніць уласнае пахаваньне (**«Сунічная паляна»,** 1957), дзьвюх сясьцёр лучыць нянавісьць і маўчаньне Бога ў іхным сэрцы (**«Маўчаньне»**, 1963). У карцінах Бэргмана атэісты моляцца за вернікаў (**«Прычасьце»**, 1963), любоў і нянавісьць сьплятаюцца (**«Шэпты й крыкі»**, 1971).

А ў **«Фані і Аляксандар»** (1982) рэжысэр спусьціўся ў маленства...

Швэдзкі творца перажыў антыбэргманаўскае паўстаньне маладых рэжысэраў-суайчыньнікаў, якія абвінавачвалі аўтара ў мэтафізычнасьці, мізантропіі і элітарнасьці. Але сам Інгмар Бэргман на пасадзе дырэктара «Драматэна» — Каралеўскага драматычнага тэатру — кардынальна зьнізіў цэны на квіткі і скараціў працягласьць спэктакляў да 1,5 гадзін — каб зрабіць мастацтва агульнадаступным.

**Андрэй Расінскі**

# Як разьвіць лідэрскія здольнасьці

Лідэр — гэта той, хто здольны натхняць іншых аптымізмам. А аптымізм — гэта не прыроджаная якасьць, а звычка, якая паддаецца трэніроўцы.

## Для чаго варта разьвіваць лідэрскія здольнасьці?

Ператварэньне ў лідэра — гэта захапляльная праца. «Хоць шмат у чым мы зьяўляемся выдатнымі спэцыялістамі, пра сябе мы ведаем надта мала. Варта адказваць сабе на пытаньне, кім мы ёсьць і чаго мы хочам. Дзякуючы гэтаму дарослы чалавек можа прыкмеціць, што ў сабе трэба разьвіваць. Ён ня будзе баяцца разважаць над тым, як ён паводзіць сябе зь людзьмі і дзейнічае пры вырашэньні задачаў. У яго хопіць адвагі працаваць над тым, у чым ён недасканалы», — сьцьвярджае псыхоляг Марыля Пэлёўска.

## Трэніроўка аптымізму

З чаго пачаць? Псыхоляг Альжбэта Солтыс мяркуе, што з трэніроўкі аптымізму. З таго, як мы інтэрпрэтуем тое, што здараецца з намі ў жыцьці.

«Мы ўсе функцыянуем, выкарыстоўваючы г.зв. пазнавальныя схемы. Калі зьвяртаем увагу толькі на нэгатыўны досьвед і не актывізуем пазытыўнага, дык прыводзім такім чынам у рух схему «з намі можа здарыцца толькі нешта благое». Тады мы пачынаем змрочна ўспрымаць сьвет, нам бракуе веры ва ўласныя сілы. Тым часам адмоўны досьвед часта падказвае нам, што неабходна зьмяніць ва ўласных паводзінах. Аднак, каб даць сабе з гэтым рады, трэба абапірацца на тое, што ў нас ужо моцнае. Калі нехта на працы зьвярнуў увагу на тое, што Вы, напрыклад, дрэнна падрыхтавалі даклад, дык прымеце гэтую заўвагу і ўзгадайце пра тое, што Вы робіце добра. Тады замест таго, каб шкадаваць сябе і злавацца, Вы зможаце напісаць лепшы даклад», — кажа Альжбэта Солтыс.

Прыклад: Вам 40 і вы завочна вучыцеся ва ўнівэрсытэце. Якраз мінула першая сэсія. Вынікамі яе Вы не задаволеныя і думаеце пра тое, што будзе далей. Памылковы падыход: у мяне жахлівыя адзнакі, давялося пераздаваць іспыт. Я ні на што ня здольны дурань (дурніца). Няма ў мяне шанцаў канкураваць з гэтымі смаркачамі-аднакурсьнікамі. Нават калі і скончу вучобу, хто возьме на працу 40-гадовага? Падыход слушны: ну так, гэтая сэсія прайшла ў мяне ня надта добра. Гэта былі мае першыя іспыты пасьля такога доўгага перапынку. Шкада. Але ж учора мне ўдалося адрамантаваць машыну і вывучыць некалькі складаных выразаў па-ангельску, ну і яшчэ Зося сказала, што ёй са мной выдатна працуецца. Трэба падумаць, як рыхтавацца да іспытаў. Паназіраю за гэтымі маладымі, чаму ў іх гэтак добра выходзіць. Падумаю над тым, што б зьмяніць у сваім спосабе навучаньня.

Важна: Гаворка не ідзе тут пра тое, каб унушаць сабе несапраўдныя посьпехі. Ані пра беспадстаўнае ўхваленьне ўласнай асобы. Трэба знайсьці належныя прапорцыі паміж спакойным стаўленьнем да жыцьця і мардаваньнем сябе ўласнымі няўдачамі. «Узгадваньне пра посьпехі мусіць абапірацца на тое, што насамрэч здарылася, а не на выдуманыя сытуацыі», — падкрэсьлівае Альжбэта Солтыс.

«З майго досьведу вынікае, што ўжо пасьля двух, трох месяцаў штодзённых трэніровак людзі зьмяняюцца непазнавальна. Яны пачынаюць верыць у сябе», — кажа псыхоляг.

## Выпрацоўка лідэрскіх рысаў

Колькі такіх рысаў? Каб стаць добрым лідэрам, неабходна навучыцца шмат якім уменьням. Іх клясыфікацыя можа быць розная, у залежнасьці ад бачаньня псыхоляга. Д-р Міраслава Гуф’елт-Лукасік, псыхоляг з Варшаўскага ўнівэрсытэту, прапануе клясыфікацыю лідэрскіх рысаў паводле трох групаў уменьняў: знаходжаньне ключа да іншых, правільная пастаноўка мэтаў, а таксама цэльнасьць уласнай



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Патэнцыял чалавека практычна бязьмежны.**



**Лідэр — гэта той, хто здольны натхняць іншых аптымізмам. Жыцьцё навучыла Паўла Севярынца захоўваць вытрымку ў самых цяжкіх сытуацыях.**

асобы.

## 1. Ключ да іншых

У дадзеную катэгорыю ўваходзяць уменьні, што дазваляюць камунікавацць з кожным і на любым узроўні. Лідэр — гэта асоба, здольная дайсьці да іншай асобы і выклікаць яе давер, сымпатыю. Перш за ўсё, трэба спазнаць групу і прыстасавацца да яе і толькі пасьля брацца за кіраваньне ёй. «Кожны, хто хоча кіраваць іншымі, мусіць перадусім быць добрым слухачом», — кажа д-р Міраслава Гуф’елт-Лукасік.

«Больш слухаць, чым казаць, даць суразмоўцу магчымасьць выявіцца», — дадае Альжбэта Солтыс.

Жаданьне спазнаць іншага чалавека, наладзіць зь ім кантакт, выклікаць ягоны давер — гэта падставовыя ўменьні, якімі трэба авалодаць ня толькі лідэру, але таксама і прадаўцам, работнікам сэрвіс-службаў і ўсім, хто часта наладжвае кантакты зь іншымі. «Калі я чую пра пасьпяховыя перамовы, як правіла, іх усіх аб’ядноўвае адно — пасьпяховы перамоўшчык перадусім слухае, намагаецца даведацца пра чаканьні і характары ўсіх бакоў і, толькі маючы такія веды, бярэ слова. І зазвычай трапляе са сваёй прапановай у дзясятку», — кажа Міраслава Гуф’елт-Лукасік.

«Удзельнікі сходу пачуваюцца, як быццам лідэр прамаўляе да кожнага зь іх. Лідэр здольны заўважыць тое, чаго іншыя ня бачаць. Гэта вынікае з уменьня кампіляваць паасобныя факты, вылучаць найважнейшае і прасочваць сувязі, — кажа Альжбэта Солтыс.

Прыклад: ваша жонка/ваш муж, насуперак абяцаньням, не заплаціў(ла) рахунак за кватэру. Памылковая рэакцыя: ты безнадзейны/на цябе нельга разьлічваць.

Правільная рэакцыя: я расчараваны(ая), што ты гэтага не зрабіў (ла). Ці можаш мне сказаць, што табе перашкодзіла?

## 2. Вызначэньне мэтаў

Лідэр мусіць умець ставіць выклікі, вызначаць мэты, перадаваць думкі і матываваць сваіх працаўнікоў. Яго падначаленыя павінныя ведаць, што належыць да іх абавязкаў, і мусяць усьведамляць тое, што ад іх працы залежыць посьпех праекту. Каб так сталася, лідэр павінен выдаваць дакладныя інструкцыі і дакладна вызначаць мэту.

Але ўвага! Дакладныя інструкцыі і канкрэтныя мэты — гэта яшчэ ня ўсё. Людзі мусяць мець свабоду дзеяньняў і разуменьне таго, што ад іх вынаходлівасьці таксама залежыць посьпех справы, а не адчуваньне таго, што яны ўсяго толькі мала значная шасьцярня ў вялізным мэханізьме.

Вызначай мэту. Людзі падзяляюцца на тых, хто «бачыць лес», і тых, якія «бачаць асобныя дрэвы». Першыя маюць агульнае бачаньне, яны здольныя прадбачыць вынікі сваіх дзеяньняў і плянаваць у пэрспэктыве дваццаці гадоў. Другія пачуваюцца выдатна, маючы добра акрэсьленую мэту. Мастацтва ў тым, каб спалучаць абедзьве рысы.

Прыклад: муж з жонкай думаюць, дзе лепш правесьці адпачынак — на моры ці ў гарах. Яны дыскутуюць, што лепш, спыняючыся на неістотных дэталях. У адпачынак едуць знэрваваныя, а можа, нават і пасвараныя. Аднак жа важным ёсьць ня тое, куды паехаць, а тое, якім чынам адпачываць. На жаль, перад ад’ездам яны не ўзгадніл і сваіх чаканьняў.

Разьлічвай сілы на свае задумы. Шмат хто з нас абмяжоўваецца толькі марамі і ня дзейнічае, баючыся рызыкі. Слушнае вызначэньне мэты і — што вельмі важна — сярэдняга ўзроўню складанасьці матывуе нас да дзеяньняў. «Надта складаныя мэты застаюцца ў сфэры мараў, а надта простыя не прыносяць задавальненьня», — кажа Альжбэта Солтыс.

У фільме «Восьмая міля» галоўны герой, будучы музыка Эмінэм, ставіць сабе адну мэту — запіс дэмастужкі. Ён ня марыць пра тое, каб стаць вядомым сьпеваком (што цікава, сапраўдныя лідэры ня мараць пра славу, а грошы для іх ня самае галоўнае).

## 3. Выпрацоўка цэльнай асобы

Цэльнасьць — гэта рыса, дзякуючы якой мы камусьці верым, бо ён выклікае ў нас давер ня толькі тым, што кажа, але і ўсімі сваімі паводзінамі. Сапраўдны лідэр патрабуе ад сябе гэтулькі ж, а нават і болей, чым ад іншых, ягоныя паводзіны сьведчаць пра тое, што ён глыбока перакананы ў сваёй слушнасьці. Гэта датычыць таксама і вэрбальнага ўзроўню — ён гаворыць рашучым тонам, у якім няма сумневаў, тонам голасу і адпаведнымі жэстамі ён здольны разьвеяць нашыя сумневы. Цэльнасьць — гэта сакрэт усіх гуру і максымальна разьвітая рыса ў харызматычных лідэраў. Харызма вынікае менавіта зь неймавернага заангажаваньня і цэльнасьці асобы.

**Вольга Данішэвіч**
**паводле gazeta.pl**



**У 2007 годзе, годзе 125-годзьдзя Купалы і Коласа, «НН» штонумар друкуе творы беларускіх паэтаў. У ранейшых нумарах пабачылі сьвет творы Генадзя Бураўкіна, Андруся Храпавіцкага, Юрася Пацюпы, Міхала Анемпадыстава, Сяргея Прылуцкага, Сяргея Сыса, Алеся Макрацова ды іншых аўтараў. Чакаем Вашых твораў.**

## АЛЕСЬ АРКУШ

# Песьні

### УСКРАІНА

За лясамі–ўзгорамі,
За сівымі зорамі
Ягадай нясьпелаю
Сьпіць краіна белая.

З поўняй разьмінулася,
Хмарай загарнулася,
Голас пахаваўшая,
Волі не пазнаўшая.

А была шляхетнаю,
Гонарам адметная,
Моцная і вольная,
Да навукі здольная.

Нашай ускраіна была!

Аблокі гоне вецер–гун,
Забыўся ён, што ёсьць Пярун,
Забыўся, што чакае нас
Сурмы працяглы сьпеўны час.

Мой сын маўчыць,
маўчу і я:
Навокал скрозь — калёнія.
Калее ў студзеньскай вадзе
Пярсьцёнак згубленых надзей.

### КАЛЕВАЛА

У белай краіне залева —
Ня блісьне ні справа, ні зьлева.
Такая вось Калевала —
Нас мала, нас мала, нас мала.

Дождж ідзе і час ідзе
Ў нашым белым горадзе.

Цікуе гадзіньніка вока
За ўсім, што віруе навокал.
І як бы ты нас ні шукала —
Нас мала, нас мала, нас мала.

Дождж ідзе і час ідзе
Ў нашым белым горадзе.

Чакаю таемнага знаку
Нібыта галоўны аракул,
Каб рэхам літаньне зьнікала —
Нас мала, нас мала, нас мала.

Дождж ідзе і час ідзе
Ў нашым белым горадзе.

Дождж скончыцца абавязкова,
Вясёлкі зазьзяе падкова.
Такая вось, брат, Калевала —
Нас шмат, дзе здавалася мала,
Нас шмат, дзе здавалася мала,
Нас шмат, дзе здавалася мала.
Нас шмат...

Дождж ідзе і час ідзе
Ў нашым белым горадзе.

Весна Касэрэс — сьпявачка, акардэаністка і кампазытар харвацка-чэска-славенска-гішпанскага паходжаньня. Шматэтнічная і яе музыка, дзе спалучаюцца традыцыі балканскага мэласу, лацінскіх рытмаў, усходніх вакальных тэхнік і эўрапейскай клясычнай музыкі. Нарадзілася ў Харватыі, ад 1990 году жыве ў Празе.

Весна выступае на канцэртах і фэстывалях у Чэхіі ды іншых краінах са сваёй групай, якая грае пераважна бразыльскую і кубінскую музыку. Аднак гэтым яе музычны дыяпазон не абмяжоўваецца — яна сьпявае сьвінг, піша музыку для тэатру, а апошнім часам пачала выступаць з сольнымі канцэртамі ў суправаджэньні акардэону.




«У тым, што я выконваю падчас жывых выступаў, ёсьць і джаз, і этна, і рок, трошкі попу, застаецца месца і для імправізацыі — нехта назаве гэта джазам, нехта скажа, што гэта занадта папсова для джазу. Звычайна я імкнуся пазьбягаць крайнасьцяў і шукаць свой шлях, сваю іскру», — кажа Весна.

Весна Касэрэс была першай у Празе сьпявачкай, якая пачала сьпяваць аўтэнтычную бразыльскую музыку — у 1995 годзе разам з мэксыканскім гітарыстам Паблам Артызам яна заклала гурт «Anima», у аснову рэпэртуару якога леглі песьні вялікіх бразыльскіх паэтаў-кампазытараў — Каэтану Вэлозу, Шыку Буаркі, Жоржы Бэна, Мілтана Насімэнту (ягоная песьня Anima дала назву гурту).

У сваім пазьнейшым, больш «джазавым» пэрыядзе творчасьці Весна зачаравала слухачоў сваёй інтэрпрэтацыяй боса-новы і самбы. Багатыя гармоніі, характэрны рытмічны ўзор акустычнай гітары, прыемнасьць і пяшчотнасьць Весьнінага голасу і шарм партугальскай мовы ў яе бразыльскім варыянце пераносяць слухачоў на бестурботныя пляжы Рыё-дэ-Жанэйра. Дарэчы, сёлета ў студзені Весна ўдзельнічала ў Рыё-дэ-Жанэйра ў канцэртах, прысьвечаных 80-годзьдзю «бацькі боса-новы» Антоніу Карлуша Жабіма.

Ад 2003 году Весна выступае і сама — як сьпявачка і акардэаністка. Яе рэпэртуар улучае ў сябе як яе ўласныя кампазыцыі, гэтак і песьні розных народаў — харвацкія, гішпанскія, мэксыканскія, бразыльскія ды іншыя. У іх спалучаюцца выразныя мэлёдыі, узбагачаныя жывымі рытмамі, вакальныя экспэрымэнты і арыгінальныя акардэонныя аранжыроўкі.

Між іншага, варта заўважыць, што Весна — жонка геніяльнага беларускага перакладчыка Сяргея Шупы.

Адзіны канцэрт Весны Касэрэс у Менску адбудзецца 2 жніўня ў клюбе «Графіці» (завулак Калініна, 16), які гэткім чынам на адзін дзень прыпыніць свае летнія вакацыі.

## ВЫСТАВЫ

### Магічныя моманты

У Музэі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр.Незалежнасьці, 47) да 11 жніўня працуе выстава скульптуры з фондаў музэю.

### Леанід Раманоўскі

У галерэі «ЛаСандр-Арт» (вул. Раманаўская Слабада, 24) да 17 жніўня працуе выстава жывапісу Леаніда Раманоўскага.

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

### «Рататуй»

**Рататуй** (Ratatouille)
ЗША, 2007, каляровы, 110 хв.
**Рэжысэр:** Брэд Бёрд
**Жанр:** Анімацыйная камэдыя
**Адзнака:** 5 (з 10)

Настольная кніга Рэмі — кулінарны зборнік, і герой марыць стаць кухарам. Усе таленты ў Рэмі ёсьць: выдатны густ, крэатыўнасьць, працаздольнасьць. Да таго ж Рэмі дапамагае парадамі сам аўтар кніжкі — тлусты кухар з ілюстрацыі, былы гаспадар рэстарану. Але ёсьць невялічкая праблема. Рэмі — пацучаня, і ягоная мара зусім не даспадобы людзям, дый хвастатым сваякам. На дапамогу герою прыходзіць хлопчык Лінгвіні... Жыцьцярадасная анімацыйная камэдыя Брэда Бёрда, вядомага па парадыйным прыгодам «Звышсямейкі». «Рататуй» — камэрны, лірычны фільм. Анімацыя дасьціпная, грымасы жывыя.

У фільме ёсьць сяброўства, каханьне, кар'ера, а зло караецца.

Кожны можа стаць кухарам! Пагодзімся з гэтым.

**Андрэй Расінскі**

## ШАШАЧНАЯ КРЫЖАВАНКА

*Прысьвячаецца беларускім сталетачнікам — бронзавым прызэрам Кубку сьвету ў Дакары*



**Па гарызанталі:** **1.** Яна прыдалася 6 для лупцоўкі гульцоў, якія «прадаюць» свае партыі. **4.** Алена … — шматразовая чэмпіёнка Беларусі па шашках, цяпер у Ізраілі. **7.** Сюжэт, закладзены аўтарам у задачу ці этуд. **8.** Імклівы рух да лідэрства ў турніры. **9.** Экс-чэмпіёнка Беларусі па шашках-64 і шашках-100 Марына … (Мар'іна Горка). **10.** Яго апісвае шашка ў найпрыгажэйшых камбінацыях. **11.** Недаабгрунтаваная вестка. **13.** Афрыканская краіна, што прытуліла сусьветны шашачны форум у сьнежні 2006 г. **17.** Шашка, падрослая ў рангу. **19.** Горад, дзе гросмайстарку Тамару Тансыккужыну ведаюць з маленства. **20.** Былы старшыня фэдэрацыі шашак, судзьдзя чэмпіянатаў Беларусі. **21.** Адзінка актыўнасьці ізатопаў. **22.** Малады майстар з Ваўкавыску, які праявіў сябе ў дакарскім Кубку сьвету.

**Па вэртыкалі:** **1.** Жыхар Вілейкі, чэмпіён краіны ў гульні празь ліставаньне паводле «сучасных правілаў». **2.** … славы — пік дасягненьняў шашыста. **3.** Накат на пазыцыю суперніка. **4.** Расейскі шашыст і літаратар, аўтар «Старадаўнасьці гульняў у шахматы і шашкі» (1915). **5.** Армэнія — …, дзе папулярныя шашкі *тама*. **6.** Процілегласьць п. 3. **12.** Смаргонскі шашачны кампазытар, рашальнік Васіль ... **14.** Герой бабілёнскай міталёгіі, лётаў на арле. **15.** Расейскі горад XIII ст. і бард XX ст. **16.** Сьляпы шашыст, якім ганарыцца Самара. **18.** Паўвыспа ў Чорным моры.

**Склаў Вольф**

**Адказы**

**Па гарызанталі.** 1. Розга. 4. Соркіна. 7. Тэма. 8. Гонка. 9. Разаева. 10. Круг. 11. Чутка. 13. Сэнэгал. 17. Дамка. 19. Уфа. 20. Шабалін. 21. Кюры. 22. Міхальчанка.

**Па вэртыкалі.** 1. Рогач. 2. Зеніт. 3. Атака. 4. Сарін. 5. Краіна. 6. Абарона. 12. Уласюк. 14. Этана. 15. Галіч. 16. Лунін. 18. Крым.



15 сутак, ці Хата №22. Акрэсьцінскі дзёньнік Алеся Каліты. Старонка 18.

МАЛЮНАК АЛЕСЯ КАЛІТЫ

# Як разьвіць лідэрскія здольнасьці

Лідэр — гэта той, хто здольны натхняць іншых аптымізмам. А аптымізм — гэта не прыроджаная якасьць, а звычка, якая паддаецца трэніроўцы. Старонка 28.

# Чаму вакол столькі зла?

У адзін дзень з жыцьця пайшлі два найвялікшыя рэжысэры сучаснасьці. 94-гадовы італьянец Мікелянджэла Антаніёні і 89-гадовы швэд Інгмар Бэргман. Старонка 27.

## УДАКЛАДНЕНЬНЕ

У артыкуле «Каранацыя ў Гудагаі» ў №27 за 26 ліпеня замест «...перад пачаткам гаміліі... выступіў арцыбіскуп маскоўскі» трэба «...перад пачаткам літургіі... выступіў арцыбіскуп маскоўскі». Перапрашаем.

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Аляксею А., Паўлу С.** Вашы вершы для газэты не пасуюць.

**Аляксею К.** Верш зь лірычным героем, які ўскрывае сабе вены, каб зьвярнуць апошнюю ўвагу каханай, вельмі шчыры і сьпелы, і ў той жа час вельмі асабісты. На маю думку, не для друку. А вось песьня зь яго магла б атрымацца.

**Аляксандру У. з Гомеля.** Іншы хдымак зьмясьцілі адмыслова — зьява характэрная ня толькі для Гомеля, а для ўсё краіны.




# А ты падпішыся!

**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,** проста падпішыце дамову. Дэталі — **старонка 17.**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВАЗЬМУ НА КВАТЭРУ

**Вазьму на кватэру** 1 ці 2 прыстойныя беларускі. Т.: 772-19-14, 912-83-86, 017-204-86-97. Яўген

### КНІГІ

**Набуду часопіс** «Узвышша» №1 за 1927 год. Т.: 017-202-01-02, 029-772-29-58 Уладзімер.

**Набуду** 1-ы том «Энцыкляпэдыі ВКЛ». Т.: 283-24-10

### РОВАРНЫ ПРАБЕГ ПА ГОМЕЛЬСКАЙ ВОБЛАСЬЦІ

**15—20 жніўня** адбудзецца турысцкі прабег на роварах, прысьвечаны 90-годзьдзю Кастрычніцкай рэвалюцыі. Акцыю праводзіць Гомельскі абласны камітэт Партыі камуністаў Беларускай, кіраўніком прабегу зацьверджаны Анатоль Ільлінчык — заслужаны геоляг Беларусі. Маршрут: Гомель–Жлобін–Парычы–Рудабелка–Петрыкаў–Тураў–Жыткавічы. Вяртаньне з Жыткавічаў – цягніком. У праграму 5-дзённага падарожжа ўваходзяць сустрэчы зь цікавымі людзьмі, наведваньне памятных мясьцінаў, адпачынак у намётавым летніку, сьпевы і шчырыя гутаркі каля вогнішча. У прабегу запрашаецца ўзяць удзел моладзь. Для гэтага неабходна мець ровар, прыналежнасьці для адпачынку на беразе ракі і жаданьне больш даведацца пра Гомельшчыну. Дадатковую інфармацыю можна атрымаць праз т. (02342) 4-33-42, (029) 399-42-26. Сьвятлана Міхальчанка

### ПАДЗЯКІ

**Шчыра дзякую** Рэдакцыі «НН», усім блізкім і знаёмым, што выказалі спачуваньні ў зьвязку з сконам майго бацькі. З.Саўка

### ШПАЦЫРЫ

**Ад 18 гадзінаў** штосчацьвер у Віцебску беларускамоўныя шпацыры ў навакольлі Дабравешчанскай царквы

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

Адэса. Члены «Саюзу рускага народу» ўжо колькі дзён трымаюць горад у страху: яны б'юць на вуліцах людзей кіямі, страляюць з рэвальвэраў. Ужо 45 чалавек зранена, нават пакалечылі некалькі малых дзяцей. Хоць у горадзе ёсьць шмат паліцыі і войска, але такія разбоі робяцца штодзень, і ніхто ім не перашкаджае. Гандаль затрымаўся, і людзі баяцца хадзіць па вуліцах, каб іх чарнасоценцы не забілі.

**«НН». №28. 1907**

**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102-71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2239. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 01.08.2007.
Замова № 4162.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102-71.